

КАРАНАВІРУС І АНКАЛОГІЯ

7

КАТОК... У ВЁСЦЫ

8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛЮТАГА 2022 г. СЕРАДА № 26 (29648)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Каб разумець, як мяняецца ўзровень жыцця, ёсць такое паняцце як рэальны рост даходаў насельніцтва. За мінулую пяцігодку рэальныя даходы беларусаў выраслі практычна ў 1,5 раза. Такі ж тэмп росту стаіць і на наступныя пяць гадоў — да 2025 года. Усе абавязацельствы дзяржавы па сацыяльных выплатах выконваюцца ў поўным аб'ёме і своечасова. Прызначаецца сямейны капітал, якім сем'і могуць скарыстацца датэрмінова для паляпшэння жыллёвых умоў. Аддаецца вялікая ўвага сацыяльнаму абслугоўванню: арганізавана дастаўка прадуктаў харчавання і лекаў пажылым людзям, аказваецца неабходная дапамога ў аказанні ім бытавых паслуг, каб яны менш выходзілі на вуліцу і берaглі сябе».*

## КОРАТКА

- Для назірання за ходам рэферэндуму акрэдытаваны 31 міжнародны назіральнік.
- **Мінлясгас прапануе спрасціць парадак рэалізацыі насельніцтву дзелавой драўніны і дроў.**
- З-за пандэміі турыстычная галіна краіны пераарыентавалася на ўнутраны рынак.
- **Беларуская калегія адвакатаў стварыла бясплатны мабільны дадатак для смартфонаў. Ён дапаможа зрабіць юрыдычную дапамогу максімальна даступнай для карыстальнікаў, спрасціць працэс пошуку і стасункаў з адвакатам.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы аддалі лёс краіны ў рукі беларускага народа»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў пасяджэнне Савета Бяспекі

**На парадку дня — пытанні, звязаныя з асноўнымі палітычнымі кампаніямі ў краіне, пытанні эканамічнага характару. А галоўная тэма — рэспубліканскі рэферэндум па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, які пройдзе ў апошнюю нядзелю лютага.**

«Мы падыходзім да лагічнага завяршэння працэсу канстытуцыйнай рэформы. Вельмі важна, што ён пачаўся не ў кабінетах, а ў працоўных калектывах, на дыялогавых пляцоўках, у рэгіёнах. Практычна ўсе ідэі і прапановы, якія там абмяркоўваліся, ляглі ў аснову змен у Асноўны Закон. На сённяшні яны распрацоўваюцца як канстытуцыйнай камісіяй, рабочай групай, прафесійнымі юрыстамі, правазнаўцамі і прайшлі шырокае абмеркаванне ў грамадстве», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ГЕРОЙ ДНЯ — АНТОН СМОЛЬСКІ!

**Беларускі біятланіст Антон Смольскі — сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Медаль ён заваяваў у індывідуальнай гонцы на 20 кіламетраў з чатырма агнявымі рубяжамі. Лідар беларускай каманды стартаваў 28-м, а да фінішу прыехаў праз 49 хв. 02,2 сек. На стрэльбішчы Антон не дапусціў ніводнага промаху. Алімпійскім чэмпіёнам стаў француз Кентэн Фіён Мае, яму Антон уступіў 14,8 секунды. Трэцяе месца — у нарвежца Ёханеса Бё.**





Фота БелТА.

З паспяховым выступленнем Антона Смольскага павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. «У гэтым сезоне ты ўварваўся ў эліту сусветнага біятлона і ўзышоў на п'едэстал на галоўных стартах чатырохгоддзя. Алімпійскі медаль, здабыты ў бескампраміснай барацьбе з наймацнейшымі атлетамі планеты, — вялікі поспех і твой асабісты, і каманды, і ўсёй краіны», — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт пажадаў спартсмену моцнага здароўя, удачы і новых перамог.

Сам герой дня расказаў прэс-службе НАК Беларусі, што ён вельмі шчаслівы. «Страшэнна шчаслівы дакладна правесці стральбу сёння, заваяваць медаль для краіны, для сваіх блізкіх. Падарыць ім масу радасных эмоцый. Удзячны сваёй камандзе. Гэта неверагодная праца трэнераў, тэхнічнага персаналу. Наш план здзейсніўся», — падзяліўся Антон Смольскі.

# ПЕРАМАГАЕ ДРУЖБА

**Любоў Дудзінская — заатэхнік-селекцыянер філіяла ААТ «Жодзішкі» ў мінулыя выхадныя памяняла прафесію і выйшла на хуткую лыжню, каб здабыць спартыўную перамогу свайму раёну ў штогадовым лыжным чэмпіянаце «Залаты колас» сярод працаўнікоў вёскі Гродзенскай вобласці. Дзякуючы Любові і яе аднавяскоўцам, каманда Смаргонскага раёна ўпэўнена паднялася на вышэйшую прыступку п'едэстала. Пра гэтае спартыўнае свята чытайце і глядзіце на 13-й старонцы.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 — 763X

22026

9 771990 763008

# «Мы аддалі лёс краіны ў рукі беларускага народа»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што рэферэндум як форма народнага волевыяўлення ў гісторыі суверэннай, незалежнай Беларусі тройчы адыграў лёсавызначальную ролю. Па яго словах, сёння прыйшоў час узмацніць Асноўны Закон палажэннямі, якія будуць забяспечваць развіццё Беларусі ва ўмовах новых выклікаў і пагроз для нашай дзяржаўнасці. «А тое, што яны будуць, ніхто не сумняваецца. Прычым новыя небяспекі будуць узнікаць увесь час. Падзеі ў Казахстане — прамое таму пацвярджэнне. Калі сказаць літаральна — чарговы сігнал трывогі для нас, для Расіі, іншых краін постсавецкай прасторы. І не толькі», — сказаў ён.

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што на рэферэндуме народ зробіць правільны выбар, узважаны і мудры. «Усё, што мы маглі зрабіць і яшчэ ў нас час ёсць, мы зрабілі. Мы данеслі народу сутнасць і аддалі лёс краіны ў рукі беларускага народа. Няхай прымае рашэнне», — падкрэсліў ён.

## Ціск не спыняецца

Аднак, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, справа не ў гэтым. А ў тым, што такі выбар не падабаецца Захаду. «Вы ведаеце, што заўсёды і ўсе рэферэндумы, і якія б там ні былі выбары не ўспрымаліся там яшчэ да пачатку іх правядзення. Успомніце мінулыя часы. Мы яшчэ не пачалі кампанію нейкую, а яны ўжо яе перакрэслілі, ім усё не падабаецца. Гэтаксама будзе і цяпер. Не сумнявайцеся, не стане выключэннем і будучая кампанія», — перакананы Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ціск на Беларусь па самых розных кірунках не спыняецца. «Разумею. Планавалі «каляровую рэвалюцыю» ў цэнтры Еўропы, а атрымалі няўдалы мяцеж. Амерыканскія (і аўтарытэтныя там) эксперты і палітолагі назвалі яго «няўдалай спробай — неканстытуцыйнага перавароту». А грошы ў гэтую «няўдалую спробу» ўкладзены вялізныя. Па нашых падліках, тое, што мы маглі адсачыць, — больш за 6 мільярдаў долараў. Для Беларусі гэта заваблачная цана. Тыя, хто іх не адпрацаваў, паспрабуюць зноў узрушыць людзей, дарэчы, што яны і робяць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пракаментаваў фэйк аб тым, што расійскі ўрад нібыта прыняў рашэнне пасылаць беларускіх ваенных у Сірыю. «Для мяне гэта стала навіной. Па цяперашніх законах гэта немагчыма без Прэзідэнта. Але я нікога нікуды не адпраўляў», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што сірыйскі ўрад папрасіў беларускі бок дапамагчы ўрачамі. «Я пагадзіўся, калі хтосьці захоча паехаць з нашых дактароў, перш за ўсё ваенных, яны паедуць. Але не зараз. У нас сваіх праблем цяпер хапае. Гэтая пандэмія яшчэ не скончылася, грып хвошча ў Мінску злева направа. У гэтай сітуацыі мы нават урачамі не можам дапамагчы сірыйцам. Там ужо не вядзецца актыўных баявых дзеянняў. Не, мы туды вайскоўцаў пашлём ваяваць... Нам там няма чаго рабіць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар канстатаваў, што беларускія дактары дапамогуць сірыйцам, калі іх дапамога будзе патрэбная. Выключна на добраахвотніцкіх асновах і толькі пасля таго, калі ў нас знізіцца напружанне ў сваіх бальніцах. Размова з урадам Расіі ішла аб тым, каб, калі беларусы будуць кагосьці туды адпраўляць, Расія гэта падтрымала.

## У нас ёсць мэта, мы павінны да яе прыйсці

«Да рэферэндуму нам будуць падкідваць усякую дахляціну, па кожным з вас будуць малаціць. Мяне ўжо адмалацілі, ужо жывога месца не засталося, што тут яшчэ больш сказаць. Я ведаю, што Андрэя Шведа (Генеральны пракурор Беларусі) пачалі паласкаць. Адкапаюць тое, чаго ты не ведаеш: тваіх прабабуль і прадзядуль. Яшчэ знойдуць, што ты з Амерыкі прыехаў. Мы ўсё гэта ведаем. Таму вы паменш на гэта глядзіце, глядзіце наперад. У нас ёсць мэта, мы павінны да яе прыйсці. Будуць ціснуць на прадпрыемствы і працоўныя калектывы, на працаўнікоў сістэмы адукацыі і аховы здароўя. Галоўны рэсурс — сацыяльныя сеткі і месенджары», — папярэдзіў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, асноўнае вастрыё нацэліце супраць членаў участковых і іншых камісій. Праваахоўныя органы ўжо атрымалі каманду абараніць гэтых людзей.

«Няхай не перажываюць тыя, хто сёння займаецца дзяржаўнымі справамі. У нас сёння не тая сітуацыя, што была ў 2020 годзе. І кожнага мы зможам абараніць, гэта наш святы абавязак. Не дай бог яны дакрануцца хоць да аднаго чалавека», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што не выключаны правакацыі з мэтай падставіць краіну пад санкцыі ці нават шантаж вайсковымі сродкамі. Ён ужо пачаўся: верталёты, беспілотнікі, расстрэл пагранічных знакаў, перасячэнне граніцы пешшу. Заяўленае раней як часовае прыбыццё ў Еўропу натаўскіх войскаў стала пастаяннай прысутнасцю, і гэты кантынгент нават нарошчваецца.

«У гэтых умовах галоўным сродкам забеспячэння стабільнасці і далейшага развіцця краіны з'яўляюцца і асабістая адказнасць кожнага чалавека за яе лёс, і калектыўны імунітэт да маніпуляцыя грамадскай свядомасцю», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён акцэнтаваў увагу, што, безумоўна, вертыкалі ўлады, эканамічнаму блоку і праваахоўным органам неабходна прыняць дадатковыя меры па забеспячэнні бяспекі і спакойнага жыцця людзей у наступны перыяд.

Таксама ўдзельнікі пасяджэння Савета Бяспекі разгледзелі прапанову ўвесці «завочную» вытворчасць па крымінальных справах у дачыненні да абвінавачаных, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Тых, хто ўчыніў або ўчыняе асабліва небяспечныя злачынствы, прадугледжаныя нацыянальным заканадаўствам.

«Падобныя падыходы даўно практыкуюцца ў шмат якіх краінах, у тым ліку еўрапейскіх. Не думаю, што новаўвядзенне закране нейкую значную колькасць нашых грамадзян. Мабыць, гэта адзінкі з ліку так званых збеглых. Яны, на жаль, ёсць. Будзе над чым падумаць тым, хто мае намер нашкодзіць краіне, людзям, эканоміцы, а потым «схавацца» за мяжой», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Даслоўна



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

## «Сёння адчуваем зваротную сувязь»

— Стабільнасць, якая ёсць у Беларусі, будзе захавана, і рэферэндум пройдзе ў спакойнай абстаноўцы, з нармальным, рабочым настроем. Цяпер ідзе канструктыўная спакойная работа па падрыхтоўцы да правядзення рэспубліканскага рэферэндуму па змяненнях у Канстытуцыю. У ёй, зрэшты, ёсць і недахопы, аб чым таксама гаварылася сёння на пасяджэнні Савета Бяспекі. Гэта датычыцца, напрыклад, неабходнасці пазбавіцца ад фармалізму, выходзіць на дыялог і знаходзіць формы, цікавыя адпаведным групам насельніцтва. Цяпер у гэту работу актыўна ўключаны парламентарыі, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў кіравання, мясцовых органаў улады, палітолагі, прадстаўнікі экспертнай супольнасці. Галоўная задача — данесці насельніцтву асноўныя навацыі, якія нясе Канстытуцыя, нацэленая ў будучыню, сфарміраваная з улікам меркавання людзей. Трэба пераканаць іх прыйсці на рэферэндум, аддаць свой голас у падтрымку Канстытуцыі з дапаўненнямі і змяненнямі.

Упэўнены, што стабільнасць, якая сёння ў нас у краіне, будзе забяспечана і ў бліжэйшыя дні, тыдні, і мы з такім жа нармальным, рабочым настроем правядзём рэферэндум. Мы сёння адчуваем зваротную сувязь, зацікаўленасць большасці, пераважнай часткі насельніцтва і ў рэферэндуме, і ў яго выніках, і ў асабістым удзеле ў гэтым мерапрыемстве. Аддаць свой голас — гэта аддаць яго за будучыню краіны, дзяцей і ўсіх суайчыннікаў, жыхароў краіны.

### Каментарый у тэму

## «Будзем гатовы забяспечыць бяспеку нашых грамадзян»

**Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** падкрэсліў, што бяспека — прыярытэт у нашай дзяржаве: «І мы проста абавязаны зрабіць усё, каб нашы грамадзяне адчувалі сябе бяспечна і ўвогуле ў жыцці, і падчас падрыхтоўкі да рэферэндуму».

«Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што калектыўнаму Захаду на чале з ЗША не падабаецца суверэнная, незалежная палітыка, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве. Але гэтая палітыка накіравана перш за ўсё на ўзняцце сацыяльнага ўзроўню жыцця нашага насельніцтва, на забеспячэнне бяспекі нашага насельніцтва. І вось гэты міралюбівы куток у цэнтры Еўропы сёння не задавальняе нашых апанентаў, на жаль. Мы бачым пастаянны прэсінг Захаду ў адносінах да Беларусі: эканамічныя санкцыі, накіраваныя на дэстабілізацыю абстаноўкі, і ваенны складнік, і тая мілітарызацыя, якая сёння праходзіць уздоўж нашых граніц», — падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч.

Ён расказаў, што на гэта накіраваны меры стратэгічнага стрымлівання, меры па забеспячэнні бяспекі, меры па правядзенні вучэнняў, якія сёння праходзяць, і комплекс іншых мерапрыемстваў. «Мы прааналізавалі падзеі мінулага года, падзеі 2020 года і ўнеслі папраўкі ў нарматыўна-прававую базу па задзейнічанні сілавога блока. Праведзены комплекс іншых мерапрыемстваў, які дапаможа прадухіліць спробы па дэстабілізацыі абстаноўкі. І мы будзем гатовы забяспечыць бяспеку нашых грамадзян», — канстатаваў Дзяржсакратар Савета Бяспекі.

Напрыканцы пасяджэння Савета Бяспекі Прэзідэнт уручыў яго членам адметныя знакі. Гэта спецыяльныя распрацаваныя знак, які члены Савета будуць насіць у паўсядзённым жыцці. Таксама Аляксандр Вальфовіч падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы назваў членаў Савета Бяспекі людзьмі, якія павінны вырашаць усе пытанні, што закранаюць жыццё нашага народа.

## Дзейсны прафілактычны эфект

**Старшыня Следчага камітэта Дзмітрый ГАРА** паведаміў журналістам, што Прэзідэнт падтрымаў прапанову ўвесці завочную вытворчасць па крымінальных справах у адносінах да абвінавачаных, якія знаходзяцца за межамі Беларусі. Ужо распрацаваны адпаведны законапраект, які ў найбліжэйшы час будзе накіраваны ў Палату прадстаўнікоў.

«Законапраектам прадугледжаны гарантыі абароны правоў абвінавачаных. Гэта значыць, выканаты стандарты, якія прадугледжаны заканадаўствам як еўрапейскіх краін, так і краін СНД, у якім сёння працуе завочная вытворчасць па крымінальных справах. Рэалізацыя гэтага інстытута нам дасць магчымасць забяспечыць няўхільнасць пакарання, а таксама забяспечыць кампенсацыю ўрону па крымінальных справах. Я думаю, што гэта будзе мець і дастаткова дзейсны прафілактычны эфект», — расказаў Дзмітрый Гара.

Акцэнты



# Сенатары — еўрадэпутатам: «Неабходна задумацца аб выпрацоўцы канструктыўнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі»

**Прэзідыум Савета Рэспублікі выступіў з заявай адносна скажэння еўрадэпутатамі сітуацыі ў нашай краіне.**

— Дэпутаты Еўрапейскага парламента працягваюць ажыццяўленне неканструктыўных дзеянняў у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, — гаворыцца ў дакуменце і прыводзяцца наступныя факты. — У заяве ад 1 лютага 2022 года распаўсюджваецца фэйкавая інфармацыя аб рэспубліканскім рэферэндуме па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, які прызначаны на 27 лютага 2022 года.

Сенатары падкрэсліваюць: атрымліваючы звесткі з недакладных і палітызаваных крыніц, еўрадэпутаты наўмысна ўводзяць у зман грамадскасць сваіх дзяржаў адносна канстытуцыйнай рэформы ў Беларусі.

— Перакананыя, што Рэспубліка Беларусь, наадварот, дэманструе краінам Еўрапейскага саюза прыклад прадуманай, планамернай работы па абнаўленні Асноўнага Закона, якая праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам, — адзначаецца ў заяве.

Прэзідыум Савета Рэспублікі звяртае ўвагу еўрадэпутатаў на тое, што падрыхтоўка змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь была распачата ў 2016 годзе. У актыўную фазу гэтая работа ўступіла ў адпаведнасці з рашэннем VI Усебеларускага народнага сходу — былі створаны Канстытуцыйная камісія і рабочая група, якія адпрацоўвалі змены ў Асноўны Закон з улікам прапаноў грамадзян Рэспублікі Беларусь.

— Шырокае ўсенароднае абмеркаванне праекта змяненняў і дапаўненняў, у рамках якога паступіла больш за 9000 прапаноў, прайшло зацікаўлена, у спакойнай і дзелавой абстаноўцы, — паведамляецца ў дакуменце. — У Беларусі, як нідзе ў іншых краінах, развіта народаўладдзе, і змены ў Асноўны Закон прымаюцца не кулуарна, а на ўсенародным рэферэндуме.

Аўтары заявы акцэнтуюць: дэпутатам Еўрапейскага парламента неабходна спыніць безгрунтоўныя разважанні і сур'ёзна задумацца аб выпрацоўцы цывілізаванай канструктыўнай палітыкі ў дачыненні да суверэннай і незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

# «МЕДЫЦЫНА ЗАСТАНЕЦЦА ДАСТУПНАЙ І ЯКАСНАЙ»

## Так запэўнівае галоўны ўрач Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль КУЛІК

**Некалькі месяцаў таму ён разам з галоўным кардыёлагам краіны Юрыем Астроўскім рабіў першую ў Магілёве аперацыю па перасадцы сэрца. Такое магло адбыцца толькі ў высокаразвітой краіне, удакладняе ён.**

— Беларусь укладвае не проста вялікія сродкі ў медыцыну — аграмадныя, — кажа Анатоль Кулік. — Што датычыцца Магілёўскай вобласці, то за два апошнія гады тут адбыліся кардынальныя змены. Практычна нанава адбудоўваецца Магілёўская абласная клінічная бальніца. І самае галоўнае, што шмат грошай укладваецца ў абсталяванне. Без гэтага нельга ўявіць сучасную медыцыну. Цяпер усё завязана на высокіх тэхналогіях, якія патрабуюць вялікіх выдаткаў. Улічваючы, колькі ідзе сродкаў на даплаты медыкам за работу ў «чырвонай зоне» каранавіруснай інфекцыі, казаць, што дзяржава хоча ўсё ўскласці на плечы людзей, будзе няправільна. Яшчэ з савецкіх часоў наша дзяржава дэкларуе, што самае дарагое ў чалавека — гэта здароўе і жыццё. Кожны павінен памятаць пра гэта і цаніць. Трэба весці здаровы спосаб жыцця, па магчымасці займацца спортам, своечасова абследавацца. Магчыма, у будучым медыцына і стане платнай, але не адразу, пасля таго як яна стане цалкам страхавой. Але ў гэтым выпадку плаціць будзе не чалавек, а страхавая кампанія.

Сёння аперацыя на сэрцы для жыхара іншай краіны ў нас каштуе пяць тысяч долараў. Грамадзянін Беларусі ні капейкі за гэта не плаціць. Гэта і ёсць тыя сацыяльныя стандарты, якія гарантуе дзяржава. Замена тазасцегнавых, каленных суставаў — таксама аперацыя не з танных. Адзін сустаў каштуе каля 2-3 тысяч долараў. Але ж усё гэта робіцца бясплатна. Выключэнне, калі чалавек хоча паставіць нешта імпартнае. І тое ён плаціць толькі за сустаў, прычым не дзяржаве, а фірме, дзе яго набывае.

Сёння стала шмат прыватных медыцынскіх цэнтраў, і гэта цудоўна — у чалавека ёсць выбар. Калі ён жадае, каб быў індывідуальны падыход, гэта выйсце. Але ніхто яго сілай туды не гоніць.

***— У Канстытуцыі, па якой мы сёння жывём, гаворыцца, што грамадзянам Беларусі гарантуецца права на здароўе, уключаючы бясплатнае лячэнне. А ў новым варыянце дапісана, «за кошт дзяржаўных сродкаў у парадку, устаноўленым законам». Некаторыя лічаць, што гэтыя словы ставяць крыж на бясплатнай медыцыне.***

— У нас ёсць сацыяльныя стандарты, якія зацверджаны Міністэрствам аховы здароўя. Гэта тое, што чалавек можа зрабіць цалкам бясплатна, для таго каб захаваць свае здароўе і жыццё. Усё робіцца па паказаннях. Калі ў чалавека ёсць праблема, ён абследуецца і лечыцца. Але бывае, што нехта хоча вось цяпер і абсалютна ўсё. Яму гэта не патрэбна па паказаннях, а ён крычыць: хачу. У такім выпадку трэба плаціць.

***— А як разумець фармулёўку ў праекце Канстытуцыі, якая выносіцца на рэферэндум: «грамадзяне клапоцяцца аб захаванні ўласнага здароўя»?***

— Так было заўсёды. Чалавек нясе адказнасць за сваё здароўе. Як разумець таго, хто жадае быць здаровым, але не прыкладае для гэтага ніякіх намаганняў? Ідзе з раніцы не ў спартзалу, а ў краму і купляе шкодныя для здароўя напоі. Мы ж лечым усіх без выключэння. І тых, хто злоўжывае шкоднымі рэчывамі, і тых, хто вядзе асацыяльны спосаб жыцця. Ад таго, што напісана ў новым варыянце Канстытуцыі, лячэнне не зменіцца. Будзе аказвацца ўся неабходная дапамога, якая агаворваецца сацыяльнымі стандартамі. Але чалавек павінен помніць, што трэба быць карысным для дзяржавы. Не віно піць, а ісці з дзецьмі на прагулку або спартыўную пляцоўку. Не наркотыкі шукаць, а займацца карыснай справай.

***— Як вы ацэньваеце змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю ў цэлым?***

— Нічога, па сутнасці, і не мяняецца. Паглядзіце, дзе менш за ўсё пацярпелі людзі ад ковіду? Там, дзе была ўстойлівая сістэма з часоў Савецкага Саюза, дзе яе не паламалі. Таму наша сістэма і вытрымала. І цяпер, перакананы, вытрымаем новую хвалю пандэміі.



***— Не магу не ўспомніць знакавую падзею мінулага года — перасадку сэрца. Аперацыя прайшла на высокім узроўні, пацыент атрымаў шанц на жыццё. І гэта ўсё адбылося ў няпросты для эканомікі і сістэмы аховы здароўя час.***

— Перасадка — гэта квінтэсэнцыя таго, што мы можам зрабіць. І тое, што акадэмік Юрый Астроўскі пагадзіўся зрабіць аперацыю з нашым удзелам у Магілёве, падкрэслівае, што рэгіянальная медыцына выходзіць на высокі рэспубліканскі ўзровень. Сёння стала магчымым рабіць вельмі высокатэхналагічныя, высакакласныя аперацыі нават у вобласці.

Гэта сведчыць, што ў нас самае сучаснае абсталяванне, якое дазваляе рабіць не толькі аперацыі. У сітуацыі з перасадкай сэрца галоўнае было выхадзіць чалавека і вярнуць у сям'ю. Ён прайшоў рэабілітацыю, пастаянна правяраецца, прымае неабходныя прэпараты, каб сэрца паспяхова працавала. Трансплантацыя ныркі — гэта ў нас ужо стандартная аперацыя, цяпер мы рыхтуемся да трансплантацыі пячонкі. Медыцына ідзе наперад. І для гэтага патрэбныя вялікія ўкладанні. І дзяржава робіць іх. Зразумейце, чаму да нас едуць лячыцца людзі з Украіны. Нягледзячы на тое, што для іх гэта платна, ім танней зрабіць такую аперацыю ў нас, чым у іх краіне.

***— Якія, на ваш погляд, медыцынскія паслугі сёння павінны быць платнымі?***

— У першую чаргу тыя, якія звязаныя з касметалогіяй. Цяпер разглядаецца пытанне, што рабіць у тых выпадках, дзе ёсць лісты чакання (чэргі на аперацыі), а чалавек хоча зрабіць аперацыю не праз год, а, умоўна кажучы, заўтра. Мы гатовыя вывесці брыгаду ў выхадны дзень, але гэта павінна быць платна.

***— Нядаўна перахварэла на каранавірус. У чарзе на прыём да ўрача сядзела дзве гадзіны. Гатовая нават была заплаціць, каб прынялі хутчэй.***

— Наша медыцына добрая тым, што па ўсіх сацыяльных стандартах экстранная дапамога аказваецца бясплатна. Тое, што вы сядзелі ў чарзе, гэта дрэнна, але гэта ўсё ж такі з'ява часовая. І гэтыя пытанні вырашаюцца. Сёння ў рабоце медыцынскіх устаноў задзейнічаны студэнты медыцынскіх ВНУ. У паліклініках субота і нядзеля зноў сталі рабочымі днямі.

***— За кошт чаго можна было б палепшыць базу медустаноў, каб не было тэхнічных праблем?***

— Усё залежыць ад сродкаў. Нават у сувязі з каранавірусам рэзка расце кошт апаратуры, расходных матэрыялаў. Дзесьці ёсць лакдаўны, дзесьці попыт павышаны. Дарэчы, дзякуючы таму што нашы прадпрыемствы не спыняліся і працягвалі працаваць, наша медыцына і трымаецца. Калі б людзей на некалькі месяцаў адправілі ў водпуск, як гэта было ў іншых краінах, тады б дакладна лячыць не было б чым.

***— Нас прывучаюць да таго, што мы павінны на 100 % кампенсаваць выдаткі на камунальныя паслугі. А не плануецца нешта падобнае зрабіць і з медыцынай? Магчыма, прыйшоў час стварыць страхавую медыцыну?***

— Увесь свет да гэтага рухаецца. Але гэта такі складаны ланцужок, яго аднаразова не вырашыш. У Расіі пераходзяць на страхавую медыцыну ўжо больш чым 20 гадоў. Але да адной роўніцы не прыйшлі. Яны робяць для паляпшэння медыцынскай дапамогі федэральныя цэнтры, у гэтыя цэнтры ўкладаюцца аграмадныя сродкі для аказання высокатэхналагічнай дапамогі. Але, магчыма, няма сэнсу распыляць грашовую масу і аказваць дапамогу там, дзе гэта не патрэбна. Так, чалавеку трэба памераць ціск, зрабіць укол, даць таблетку. Але навошта ў маленькім раёне трымаць вялікі штат урачоў? У нас сёння ад аднаго райцэнтра да другога можна даехаць за 20 хвілін.

Цяпер вырашаецца пытанне аб неабходнасці ўзбуйнення раённых бальніц, якія возьмуць на сябе вялікія «кусты» па аказанні дапамогі там, дзе проста немагчыма трымаць вялікі штат. Каб хірург нармальна працаваў, ён павінен рабіць не менш 100 аперацый за год. Калі менш, то кожная аперацыя становіцца як вайна: павялічваецца рызыка і для пацыента, і для хірурга. Павінна быць пастаянная практыка.

Мы абавязкова прыйдзем да ўзбуйнення раённых бальніц, якія будуць аказваць дапамогу не аднаму раёну, а некалькім. Наступным этапам будзе паляпшэнне ўзроўню абласных бальніц, каб дапамога была не толькі даступнай, але і якаснай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ДАСЛОЎНА



**Алег РУМО, дырэктар МНПЦ хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі, член Савета Рэспублікі:**

«Той аб'ём дапамогі, які законам аб ахове здароўя агавораны, захаваецца. Мы нічога ў гэтым пытанні не мяняем. Але людзі ўсё роўна сталі сумнявацца. Вельмі выразна прасочваецца сувязь: беларускае грамадства на сёння не гатовае ні клапаціцца пра сваё здароўе ў поўным сэнсе гэтага слова, ні за гэтае здароўе плаціць. А значыць, захаваем бясплатную медыцынскую дапамогу, будзем рабіць так, каб дапамога была вельмі добрага сярэднееўрапейскага ўзроўню. Пры гэтым мы дэкларатыўна заклікаем кожнага паклапаціцца аб сваім здароўі.

Вельмі проста сказаць, што ў Беларусі таксама не бясплатная медыцына. У такім выпадку я прыводжу прыклад сваіх украінскіх пацыентаў, што, каб прыехаць на лячэнне ў Беларусь, прадаюць кватэры, бяруць крэдыты, якія невядома хто будзе аддаваць, калі пацыент не паправіцца. Я тады апаніруto і кажу: знайдзіце мне чалавека ў Беларусі, хто дзеля таго каб атрымаць падобнае лячэнне ў выглядзе трансплантацыі, прадаў кватэру або ўзяў казачны крэдыт. Я не палянуюся ўстаць у тры гадзіны ночы, прыеду і пагляджу яму ў вочы.

Пры гэтым калі мы возьмем зрэз грамадства, то абсалютная большасць вельмі цэніць гэтую бясплатную ахову здароўя, і ў душы, хай нават не дэкларатыўна, усе разумеюць, які гэта вялікі здабытак, і ўсе вельмі баяцца гэта страціць».

**Ірына ТРУС, спецыяліст па сацыяльнай рабоце тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна:**

— Маючы адбыцца рэферэндум згуртуе беларусаў, якія будуць усёй краінай галасаваць за новы праект Канстытуцыі, выбіраючы стратэгію развіцця на будучыню. Свет не стаіць на месцы, і любыя змяненні заканамерна прадыктаваныя часам і новым становішчам. Змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон краіны абумоўленыя развіццём нашага грамадства. На рэферэндуме мы будзем самастойна прымаць рашэнне, якую будучыню хочам бачыць для сябе і наступных пакаленняў. Я лічу, што гэтая значная падзея згуртуе людзей. І самае галоўнае — голас кожнага беларуса будзе пачуты.

Усе пытанні, якія выклікаюць актыўнае абмеркаванне ў грамадзян, узнімаюцца ў тым ліку на выязных дыялогавых пляцоўках і сустрэчах з насельніцтвам і актывам прадпрыемстваў. Сярод людзей «залатога ўзросту» Віцебскага раёна нямала спрэчак выклікаў артыкул аб ахове здароўя і асабістай адказнасці за яго кожнага грамадзяніна. У некаторых узнікалі пытанні, але спецыялісты кваліфікавана праяснялі гэтыя моманты. Жыхары раёна актыўна ўключыліся ў абмеркаванне, і яны не застаюцца ў баку, разумеючы, ад каго залежыць будучыня і іх саміх, і ўсёй краіны.

Мяне як прафесіянала і грамадзяніна зацікавіў артыкул аб клопаце і падтрымцы дзяржавай шматдзетных сем'яў, дзяцей-сірот і людзей іншых уразлівых катэгорый. Я цалкам за новую Канстытуцыю, упэўненая ў сваім выбары. Прыемна, што людзі сталі станоўча адносіцца як да абнаўлення Асноўнага Закона, так і да рэферэндуму. Гэта сведчыць аб тым, што яны гатовыя ісці наперад і бачаць перспектывы ў будучыні.

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

На слыху

# ПЕНСІІ І ЗАРПЛАТЫ: ТОЛЬКІ РОСТ

**Зарплаты бюджэтнікаў плануюць павышаць і далей — да 2025 года ў асобных катэгорый работнікаў яны мусяць вырасці ў 1,5—2 разы. Пенсіі таксама павялічваюцца і пакуль перавышаюць узровень інфляцыі. Якія павышэнні адбудуцца сёлета і колькі на гэта плануецца патраціць сродкаў, абмяркоўвалася на выніковым пасяджэнні калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Прыводзім асноўныя моманты.**

## Зарплаты бюджэтнікаў будуць павышацца і далей

За 2021 год намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата па краіне павялічылася на 14,3 працэнта і склала 1434,4 рубля (у снежні — 1675,3 рубля).

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны нагадалі, што адна з найважнейшых задач, прадугледжаных Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2025 года, — павышэнне ўзроўню аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы. Так, да 2025 года плануецца павялічыць заработную плату асобным катэгорыям работнікаў бюджэтнай сферы ў 1,5-2 разы. Такім чынам, прыняты меры па павелічэнні заработнай платы выхавальнікам і памочнікам выхавальнікаў дзіцячых дашкольных устаноў, работнікам устаноў сацыяльнага абслугоўвання і культурна-асветніцкіх устаноў шляхам устанаўлення дадатковых стымуляцыйных выплат.

Акрамя таго, у 2021 выплачваліся дадатковыя штомесячныя надбаўкі работнікам сістэмы аховы здароўя, якія працуюць ва ўмовах, звязаных з інфекцыямі. Працягвалася дзеянне рэжыму працы вахтавым метадам і выплата дадатковых надбавак для работнікаў асобных дзяржаўных устаноў, якія аказваюць сацыяльныя паслугі.

З улікам прынятых мер намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый за 2021 год павялічылася ў параўнанні з адпаведным перыядам 2020 года на 13,5 працэнта і склала 1142,2 рубля (за снежань — 1268,5 рубля).

Для забеспячэння далейшага росту заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы з 1 студзеня 2022 года памер базавай стаўкі павялічаны са 198 да 207 рублёў (тэмп росту — 104,5 %). На працягу года плануецца і другое павышэнне памеру базавай стаўкі. Акрамя таго, павялічаны памер аднаразовай выплаты на аздараўленне з 0,5 да 1 акладу за год.

Устаноўлены дадатковыя стымуляцыйныя выплаты асобным катэгорыям работнікаў:

- настаўнікам і выкладчыкам, якія ажыццяўляюць функцыі класнага кіраўніцтва, куратарства вучэбнай групай — надбаўка за класнае кіраўніцтва (куратарства вучэбнай групай) у памеры 100 працэнтаў базавай стаўкі;
- работнікам культуры — надбаўка за працу ў галіне ў памеры 16 працэнтаў ад акладу работніка;
- работнікам сферы сацыяльнага абслугоўвання — надбаўка за працу ў сферы сацыяльнага абслугоўвання ў дыферэнцыраваных памерах ад 20 да 90 працэнтаў базавай стаўкі.

У 2022 годзе на выплату зарплат бюджэтнікам прадугледжана каля 12,6 мільярда рублёў.

## Узровень пенсій павінен расці хутчэй за інфляцыю

Кожны чацвёрты жыхар Беларусі (каля 26 % насельніцтва) — пенсіянер. Асноўная задача ў галіне пенсіённага забеспячэння — падтрыманне рэальных памераў пенсій.

У 2022 годзе застаецца задача забеспячэння росту памераў пенсій вышэй за ўзровень інфляцыі. З 1 сакавіка 2022 года ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 31 студзеня 2022 г. № 24 «Аб павышэнні пенсій» працоўныя пенсіі (па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з прычыны страты карміцеля) будуць павышаны на 7 працэнтаў.

У выніку павышэння сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацоўнага пенсіянера (уключаючы надбаўкі і даплаты) павялічыцца на 6,3 працэнта і ў сакавіку 2022 годзе складзе 580 рублёў. На гэтае павышэнне пенсій будзе накіравана 757 мільёнаў рублёў.

У цэлым на выплату пенсій у 2022 годзе запланавана каля 16,1 мільярда рублёў.

## Як назапасіць на другую пенсію?

З 1 кастрычніка гэтага года ўводзіцца дадатковы від пенсіённага страхавання ў страхавой арганізацыі — добраахвотнае страхаванне дадатковай назапашвальнай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы.

Працаваць гэты механізм будзе наступным чынам. Работнік заключае дагавор са страхавой кампаніяй «Стравіта», накіроўвае ў пенсіённыя назапашванні ад 1 да 10 % свайго заробку. Такі ж узнос, але не большы за 3 %, робіць яго работадавец. Пры гэтым для работадаўца суразмерна зніжаецца яго агульны ўзнос на пенсіённае страхаванне. Гэта значыць, дадатковай нагрузкі на прадпрыемства няма.

Як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, увядзенне праграмы пашырыць для грамадзян магчымасці сфарміраваць дадатковыя зберажэнні на старасць. Акрамя таго, сродкі грамадзян, якія ўдзельнічаюць у новым страхаванні, будуць задзейнічаны ў развіцці эканомікі як крыніца «доўгіх грошай» і ўнутраны інвестыцыйны рэсурс.

**Алена КРАВЕЦ.**

Па палічках

# Ключ для электроннага дакумента

## Як карыстацца паслугамі з дапамогай ID-карткі, мабільніка і АС ІФЮА

**Стварэнне сістэмы электроннага ўрада, на думку экспертаў лічбавай галіны, дазволіць змяніць жыццё чалавека ў лепшы бок адпаведна з яго жаданнямі і ўзростам. І на гэтым шляху Беларусь імкнецца настолькі пашырыць колькасць сэрвісаў для фізічных асоб, каб у будучым чалавек, не выходзячы з дому, мог атрымліваць максімум паслуг. Надыходу электроннай будучыні, як лічаць спецыялісты, спрыяе сярод іншага і Адзіная сістэма ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб (АС ІФЮА), якая была створана ў межах дзяржпраграмы развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016—2020 гады. З 17 студзеня 2022-га яна перайшла ў паўнавартасны рэжым работы, і грамадзяне, якія маюць ID-карткі або электронны лічбавы подпіс, могуць працаваць праз АС ІФЮА з інфармацыйнымі сістэмамі і атрымліваць пэўныя паслугі. Якім чынам працуе сістэма? Што ўмеюць новыя пашпарты? Як падпісаць электронны дакумент з дому ці ў арганізацыі? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнт «Звязды» знайшла ў Дзяніса САКРАТАРОВА, вядучага спецыяліста аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг.**

### ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ І ДАДАТКОВЫЯ ЗВЕСТКІ

Перш чым паглыбляцца ў лічбавыя магчымасці, варта разабрацца з некаторымі паняццямі, каб было прасцей. Электронны лічбавы подпіс (ЭЛП) пад электронным дакументам — гэта аналаг звыклага подпісу на паперы, які мы пакідаем ад рукі, і ў пэўным сэнсе з'яўляецца вынікам дзеяння чалавека. Аднак перш чым падпісаць такі дакумент з дапамогай ЭЛП, трэба выпрацаваць непасрэдна сам электронны подпіс, для чаго выкарыстоўваюцца два ключы: адкрыты і закрыты. Такім чынам з'явіўся тэрмін «ключ электроннага лічбавага подпісу». Менавіта «сертыфікат адкрытага ключа» фізічныя і юрыдычныя асобы і атрымліваюць у рэгістрацыйным цэнтры. Ключ ЭЛП можа быць, па жаданні чалавека, запісаны на спецыяльны носьбіт (флэшку) або сім-карту да тэлефона, растлумачыў спецыяліст:

*— Большасць ключоў ЭЛП, якія цяпер набываюць грамадзяне, — сертыфікаты юрыдычных асоб. З іх дапамогай можна атрымліваць электронныя паслугі і ажыццяўляць адміністрацыйныя працэдуры. Аднак асноўная мэта іх выкарыстання цяпер — падпісанне электронных дакументаў, справаздач у падатковую інспекцыю і Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. У такім сертыфікаце ўказана інфармацыя аб юрыдычнай асобе: назва арганізацыі, імя, імя па бацьку і прозвішча яе работніка, а таксама яго пасада.*



Дзякуючы АС ІФЮА дзяржорганы і арганізацыі атрымалі больш магчымасцяў і могуць цяпер ідэнтыфікаваць чалавека, які звярнуўся да іх са сваёй ID-карткай асабіста ці праз адпаведны сайт арганізацыі, а таксама яго электронны лічбавы подпіс. Акрамя таго, дзяржорганы могуць атрымліваць звесткі, якіх няма на ID-картцы, у прыватнасці, інфармацыю пра сямейнае становішча, наяўнасць дзяцей і месца рэгістрацыі чалавека. У адзінай сістэме ідэнтыфікацыі запыт такой дадатковай інфармацыі рэалізаваны з атрыманнем згоды чалавека. Сваю згоду грамадзянін падпісвае, выкарыстоўваючы ЭЛП, які знаходзіцца на ID-картцы.

*— Для чалавека АС ІФЮА зручная тым, што яму не трэба мець пры сабе пакет дакументаў, калі ён прыходзіць у пэўную арганізацыю, — дастаткова ID-карткі, каб ідэнтыфікаваць сябе і ажыццявіць юрыдычна значнае дзеянне ў сістэме, а таксама атрымаць больш паслуг. А спецыялісту не трэба дадаткова сканіраваць папяровыя афіцыйныя паперы асобы ці ўручную ўводзіць у сістэму даныя з іх. У будучым колькасць дадатковых сэрвісаў, даступных праз сістэму, будзе павялічвацца, каб пэўны аператар мог атрымліваць і іншыя звесткі, неабходныя для аказання паслугі чалавеку, — мяркуе спецыяліст. — Напрыклад, інфармацыю аб нерухомасці і даведку аб займаных грамадзянінам памяшканнях, калі ён хоча стаць на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.*

Летась у адзінага партала электронных паслуг з'явілася новая версія — АПК «Платформа» (platform.gov.by). Адно з істотных адрозненняў ад папярэдняй версіі партала зводзіцца да магчымасці выкарыстання ID-карткі для атрымання паслуг. Калі чалавек аўтарызуецца ў ёй, у тым ліку з дапамогай ID-карткі, ён зможа атрымліваць шэраг даступных там электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур. Сярод агульнадаступных паслуг — магчымасць атрымаць звесткі пра рэгістрацыю, сямейнае становішча, выплаты, на якія работадаўцам налічаны страхавыя ўзносы ў ФСАН.

Перавагі АС ІФЮА ў перыяд доследнай эксплуатацыі ўжо ацанілі шэраг арганізацый, сярод якіх Белтэлекам, А1, Інстытут прыкладных праграмных сістэм, «Статусбанк», Віцебскаблгаз, Мінсувязі, інфармацыйна-вылічальны цэнтр Мінфіна.

### ЯК СТВАРЫЦЬ ЭЛП З ДАПАМОГАЙ ID-КАРТКІ Ў АРГАНІЗАЦЫІ І ДОМА

З верасня 2021-га ў Беларусі пачалася масавая выдача ID-картак, дзе ўказаны прозвішча, імя і імя па бацьку ўладальніка, яго ідэнтыфікацыйны нумар, а таксама запісаны асабісты ключ ЭЛП для фізічнай асобы. Такім чынам уладальнікам новых пашпартоў не трэба дадаткова звяртацца па атрыманне ключа. Яны могуць падпісваць электронныя дакументы сваім ЭЛП з дапамогай уласнай ID-карткі і спецыяльнай прылады для яе счытвання. І гэтыя дзеянні будуць мець юрыдычную сілу.

*— Разам з новым пашпартам чалавек атрымлівае і два пін-коды да ID-карткі. Выкарыстоўваючы першы пін-код, ён з дапамогай АС ІФЮА ідэнтыфікуецца ў інфармацыйнай сістэме дзяржоргана ці арганізацыі, а ўводзячы другі — выпрацоўвае ЭЛП і падпісвае дакумент, — удакладніў Дзяніс Сакратароў. — Калі чалавек звяртаецца да аператара (у пэўную арганізацыю), ён прыкладае сваю ID-картку да счытвальніка, каб сістэма яго ўбачыла. А вось каб даць ёй доступ да асабістых даных на ID-картцы (трапіць у асабісты кабінет карыстальніка), чалавеку трэба ўвесці першы пін-код, то-бок прайсці аўтэнтыфікацыю. Каб пацвердзіць дазвол на атрыманне арганізацыяй дадатковай інфармацыі пра сябе, грамадзянін уводзіць у сістэме другі пін-код — такім чынам ён падпісвае згоду на гэта. І ўжо пасля таго чалавек можа атрымаць электронны сэрвіс, па які ён прыйшоў.*

Калі грамадзянін хоча атрымліваць нейкую інфармацыю аб сабе, электронныя паслугі або падпісваць дакументы з дапамогай сваёй ID-карткі з дому, яму прыйдзецца абзавесціся ўласным счытвальнікам карткі. На сайце Мінсувязі ўказаны пералік патэнцыяльных арганізацый-пастаўшчыкоў счытвальнікаў, прадукцыя якіх лічыцца гарантавана паўнавартаснай (кошт іх ад 80 да 200 рублёў). А можна купіць на іншых інтэрнэт-рэсурсах за 20-30 рублёў, аднак гарантыі на іх карэктную работу з персанальным камп'ютарам будуць пад пытаннем.

### ЯК СТВАРЫЦЬ ЭЛП НА МАБІЛЬНЫМ ТЭЛЕФОНЕ

Падпісваць дакументы, якія будуць мець юрыдычную сілу, непасрэдна са свайго мабільніка, пэўна ж, зручна. Каб зрабіць гэта, патрэбная адмысловая сім-картка для тэлефона, якая падтрымлівае электронны лічбавы подпіс. Акрамя звыклага пін-коду ад тэлефона, у яе закладзены яшчэ два пін-коды, неабходныя для доступу да дадатку, з дапамогай якога будзе выпрацаваны ЭЛП. Першы пін-код указваюць, каб ідэнтыфікаваць карыстальніка, то-бок, каб чалавек пацвердзіў сістэме, што ён — гэта ён. А другі пін-код выкарыстоўваюць, каб выпрацаваць ЭЛП, расказаў спецыяліст:

*— Спецыяльна нейкі дадатак на тэлефон устанаўліваць не трэба. Ён ужо ўключаны ў пакет праграм, які мабільныя аператары ў нашай краіне прапануюць для карыстальнікаў іх паслуг. У гэтым дадатку, дарэчы, можна ўбачыць даныя свайго ключа, напрыклад, нумар і тэрмін яго дзеяння. А каб паставіць свой ЭЛП, на тэлефоне ці любой іншай прыладзе трэба ўвайсці ў сістэму, дзе вы хочаце падпісаць дакумент. Можна ўвайсці ў гэтую сістэму з дапамогай першага пін-кода, адкрыць у ёй свой дакумент і націснуць кнопку «падпісаць». На экране з'явіцца акенца з нумарам транзакцыі, а на тэлефон прыйдзе СМС-паведамленне, што вы намагаецеся падпісаць дакумент у пэўнай сістэме з указаннем нумара транзакцыі. Вы пацвярджаеце сваю згоду, указаўшы другі пін-код. У гэты момант выпрацоўваецца ЭЛП і дакумент падпісваецца. Прыклад работы такой сістэмы — сэрвіс дастаўкі электронных дакументаў MDoc, які распрацаваны Нацыянальным цэнтрам электронных паслуг.*

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Сталічны ракурс

# «НАШ РАЁН КАМФОРТНЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ, ПРЫЕМНЫ ДЛЯ АДПАЧЫНКУ

**Савецкі раён Мінска ўваходзіць у тройку першых раёнаў беларускай сталіцы. Але сваю цяперашнюю назву ён атрымаў у 1961 годзе. Сёння на яго тэрыторыі пражывае больш за 160 тысяч чалавек. Як і іншыя сталічныя муніцыпальныя адзінкі, Савецкі раён у апошнія гады актыўна развіваецца. Больш падрабязна аб гэтым карэспандэнту «Звязды» расказаў кіраўнік адміністрацыі раёна Сяргей ХІЛЬМАН.**



***— Сяргей Анатольевіч, дык з якога часу раён адлічвае сваю гісторыю: з 1938-га — як пераемнік былога Варашылаўскага раёна, з 1961-га, калі атрымаў цяперашнюю назву, ці з 1977-га, калі сфарміраваўся ў сваіх сучасных граніцах?***

Савецкі раён — адзін з самых старых раёнаў Мінска. Гістарычна вызначыліся чатыры яго асноўныя зоны: Залатая Горка, Камароўка, Сельгаспасёлак, Зялёны Луг. У 1930-я пачалося фарміраванне Камароўскай плошчы (цяпер Якуба Коласа). Былі рэканструяваны так званыя Камароўскія вілы (зліццё былых Лагойскага і Барысаўскага трактаў).

Мінск паступова разрастаўся. Улічваючы значны рост насельніцтва сталіцы (218 тысяч чалавек), Прэзідыум ЦВК БССР 17 сакавіка 1938 года прыняў пастанову аб утварэнні ў сталіцы трох гарадскіх раёнаў: Сталінскага, Кагановіцкага і Варашылаўскага (з 2 лістапада 1961 года — Савецкага раёна). У сувязі з пашырэннем горада Савецкі раён падзяляўся двойчы. Менавіта з яго складу ўтварыўся спачатку Першамайскі, а потым і Цэнтральны раёны горада (1969 год). Таму днём нараджэння раёна лічыцца 17 сакавіка 1938 года.

**«Нягледзячы на шчыльнасць наяўнай забудовы на тэрыторыі Савецкага раёна вядзецца будаўніцтва жылля. Завершана ўзвядзенне грамадскіх будынкаў. У найбліжэйшай перспектыве на 2022—2023 гады плануецца ўвесці ў эксплуатацыю шэраг шматкватэрных жылых дамоў».**

Савецкі раён у сучасных граніцах знаходзіцца з 1977-га. Размешчаны ў паўночнай частцы горада паміж вуліцамі Ліліі Карастаянавай, Крапоткіна, праспектам Машэрава, Казлова, Платонава, праспектам Незалежнасці, вуліцамі Сурганава, Якуба Коласа, Лагойскім трактам. У красавіку 2004-га да раёна былі далучаны вёска Цна і тэрыторыя вёскі Баравая.

***— У чым заключаюцца асноўныя адрозненні Савецкага раёна ад іншых муніцыпальных утварэнняў горада?***

— Па-першае, Савецкі раён — адзін з самых маленькіх у сталіцы па плошчы, але з высокай шчыльнасцю насельніцтва. Па-другое, гэта маладзёжны раён. У трох ВНУ і сямі сярэдніх спецыяльных навучальных установах вучыцца каля 30 тысяч маладых людзей. Трэцяя частка з іх пражывае ў 35 маладзёжных інтэрнатах тут жа, у раёне. Маладзёжнай палітыцы ўдзяляецца першачарговая ўвага. Мы пастаянна знаходзімся ў кантакце з кіраўніцтвам устаноў адукацыі, каб ведаць надзённыя праблемы і запатрабаванні моладзі. Ад гэтага залежыць стварэнне камфортных умоў для самарэалізацыі маладых людзей — атрымання адукацыі, арганізацыі вольнага часу, спартыўных і культурных мерапрыемстваў.

Сёння карыстаюцца папулярнасцю ў маладзёжным асяроддзі дыялогавыя пляцоўкі. Тэматыка самая розная. Абмяркоўваюцца, як правіла, надзённыя праблемы і тэмы, якія хвалююць моладзь. Вельмі папулярная патрыятычная тэма. Праведзена больш за 160 дыялогавых пляцовак, у якіх узяло ўдзел больш за 5 тысяч чалавек. Студэнты актыўна ўключыліся ў абмеркаванне дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Іх цікавілі многія дапаўненні, асабліва роля Усебеларускага народнага сходу, захаванне гістарычнай праўды аб лёсе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, роля моладзі ў жыцці дзяржавы і грамадства.

Праводзіцца работа па ўключэнні студэнтаў у органы маладзёжнага самакіравання. Нядаўна прайшло гарадское мерапрыемства «Мінская змена — 2021», у якім удзельнічалі шэсць прадстаўнікоў ВНУ раёна. Юнакі і дзяўчаты прапанавалі цікавыя ідэі, праекты ў сферы сацыяльнай палітыкі, развіцця медыярэсурсаў і іншыя. Вялікую дапамогу моладзь аказвае ў ахове правапарадку. Напрыклад, 90 працэнтаў дружыннікаў тэрытарыяльнай добраахвотнай дружыны — гэта моладзь.

***— На тэрыторыі Савецкага раёна няма такіх буйных прадпрыемстваў, як МАЗ, МТЗ, «Атлант», але ўсё ж такі, які ўклад ён робіць у агульную скарбонку сталіцы?***

— Згодзен, такіх буйных арганізацый — «шматтысячнікаў» у нас няма. Разам з тым прамысловасць у раёне развіваецца добрымі тэмпамі. Паспяхова працуюць 15 найбуйнейшых арганізацый з колькасцю звыш 100 чалавек, сярод якіх ААТ «Амкадор-УКБ», ААТ «Амкадор-Белвар», ААТ «Прамсувязь», прыватныя кампаніі, якія выпрабляюць у тым ліку інавацыйную прадукцыю.

Савецкі раён мае найбольшую ўдзельную вагу ў дабаўленай вартасці, што ствараецца сталіцай, па транспартнай дзейнасці, паколькі на нашай тэрыторыі размешчаны ААТ «Газпрам-ТрансгазБеларусь». Немалая ўдзельная вага ў маштабах горада і ў экспарце паслуг, аптовым тавараабароце, інвестыцыях, якія прыцягваюцца. Раён заўсёды ў тройцы лідараў па ўзроўні заработнай платы, а таксама традыцыйна ўносіць значны ўклад у аб'ём падатковых паступленняў па Мінску.

***— Якіх поспехаў дабіліся працаўнікі раёна летась?***

— Мінулы год быў дастаткова паспяховы ў эканамічным плане, забяспечана выкананне большасці паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Амаль на трэць павялічыўся аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі, амаль у два разы павялічылася ўдзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў аб'ёмах вытворчасці ў параўнанні з папярэднім годам, значна ўзрос як экспарт тавараў, так і экспарт паслуг.

У мэтах далейшага развіцця міжнароднага супрацоўніцтва летась мы падпісалі два пагадненні з Кітайскай Народнай Рэспублікай — з раёнам Чанін (г. Шанхай) і раёнам Няньша (г. Гуанчжоў). Прадпрыемствы прадаўжаюць інвеставаць у асноўныя сродкі, затраты на набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў арганізацыямі раёна павялічыліся больш як на трэць.

***— Як павышаецца якасць жыцця жыхароў Савецкага раёна, як змяняецца яго знешні выгляд?***

— Якасць жыцця людзей у першую чаргу залежыць ад узроўню заработнай платы. Мы ўвесь час працуем з арганізацыямі і кантралюем своечасовасць яе выплаты. Узровень заработнай платы грамадзян, якія працуюць на прадпрыемствах Савецкага раёна, на 40 працэнтаў перавышае сярэднюю па краіне, гэта другі па ўзроўню паказчык сярод 9 раёнаў сталіцы. На тэрыторыі раёна штогод павялічваецца колькасць магазінаў, гандлёвых сетак, з'яўляюцца новыя фарматы рознічных гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання.

Нягледзячы на шчыльнасць наяўнай забудовы на тэрыторыі Савецкага раёна вядзецца будаўніцтва жылля. Завершана ўзвядзенне грамадскіх будынкаў. У найбліжэйшай перспектыве на 2022—2023 гады плануецца ўвесці ў эксплуатацыю шэраг шматкватэрных жылых дамоў. У рамках распараджэнняў кіраўніка дзяржавы праводзіцца абнаўленне забудовы ў раёне вул. Я. Коласа — вул. Кульман — вул. В. Харужай.

**«У сувязі з пашырэннем горада Савецкі раён падзяляўся двойчы. Менавіта з яго складу ўтварыўся спачатку Першамайскі, а потым і Цэнтральны раёны горада (1969 год). Таму днём нараджэння раёна лічыцца 17 сакавіка 1938 года».**

***— Якія новыя аб'екты з'явяцца на карце Савецкага раёна ў недалёкай будучыні? Што яшчэ цікавага ў планах развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі?***

— Плануецца рэканструкцыя «13-й гарадской паліклінікі». У прыбудове размесціцца цэлы шэраг спецыялізаваных аддзяленняў, што, безумоўна, палепшыць якасць медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. У адпаведнасці з рашэннем Мінгарвыканкама плануецца знос малапавярховай забудовы ў квартале вул. Лук'яновіча — вул. Усходняя — вул. 1-я Пасялковая — вул. Л. Бяды з будаўніцтвам шматпавярховай забудовы. Гэтую пляцоўку забудоўшчык вызваліць у першым паўгоддзі 2023-га.

Адна з «фішак» раёна — месцы масавага камфортнага адпачынку: Парк Дружбы народаў і Цнянскае вадасховішча. У планах сёлета ўладкаваць на вадасховішчы новы пляж. Гэтая зона адпачынку з'явіцца на востраве насупраць выратавальнай станцыі. На дадзеныя мэты Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выдзяляе 80 тысяч рублёў.

Лічу, што Савецкі раён — тая сталічная тэрыторыя, дзе людзям камфортна жыць і прыемна адпачываць.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**
**Фота з архіва адміністрацыі Савецкага раёна.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Пуцін перайшоў да дээскалацыі». Перагаворы з Макронам — у люстэрку заходніх СМІ

**Расія «рушыла» да дээскалацыі ў сітуацыі вакол Украіны. З такім сцвярджэннем выступіла газета Financial Times па выніках перагавораў Уладзіміра Пуціна і Эмануэля Макрона, прэзідэнтаў Расіі і Францыі адпаведна. Іх сустрэча адбылася ў Маскве.**

Пасля пяцігадзіннай сустрэчы прэзідэнт Францыі сказаў, што расійскі калега запэўніў яго ў сваёй гатоўнасці гаварыць аб дээскалацыі. Пуцін, аднак, быў «крытычна настроены ў адносінах да НАТА, абвінавачваючы Захад і Украіну ў крызісе, але сказаў, што Расія зробіць усё магчымае, каб дасягнуць прымальных для ўсіх кампрамісаў па еўрапейскай бяспецы», — піша газета.

«Думаю, цалкам верагодна, што нейкія яго ідэі і прапановы, нават калі пра іх, напэўна, рана казаць, могуць стаць часткай асновы для нашых наступных сумесных крокаў», — прыводзіць словы прэс-сакратара прэзідэнта РФ Дзмітрыя Пяскова FT.

### Кітай выступіў супраць далейшага пашырэння НАТА

**Кітай лічыць, што пашырэнне НАТА не садзейнічае глабальнай бяспецы і стабільнасці, гаворыцца ў заяве, апублікаванай на афіцыйным сайце прадстаўніцтва КНР у ЕС.**



«Праз трыццаць гадоў пасля заканчэння халоднай вайны НАТА працягвае пашыраць сваю геаграфію і дыяпазон аперацый, займаецца блокавай палітыкай і канфрантацыяй. Гэта не садзейнічае глабальнай бяспецы і стабільнасці», — гаворыцца ў паведамленні.

Кітайскі бок падкрэслівае, што рэгіянальная бяспека не павінна забяспечвацца за кошт умацавання або пашырэння ваенных блокаў.

Раней у сумеснай заяве аб міжнародных адносінах Масква і Пекін выступілі супраць далейшага пашырэння НАТА, заклікалі альянс адмовіцца ад падыходаў часоў халоднай вайны.

### Ва Украіне цэны на хлеб дасягнулі рэкордных адзнак за апошнія пяць гадоў

**Ва Украіне цэны на хлеб выраслі да рэкордна высокіх адзнак за апошнія пяць гадоў, паведамляе ўкраінскае выданне «Страна».**

Пшанічны хлеб пачаў даражэць з канца лета 2021 года, і ўжо да верасня цэны выраслі амаль на 50 капеек. З таго часу хлеб прадаўжаў даражэць, а да лютага цана дасягнула рэкорднай за пяць гадоў адзнакі — 25,9 грыўні ($0,92).

Не абмінула падаражанне і жытні хлеб: у студзені ў супермаркетах яго можна было купіць за 30,6 грыўні ($1,09), але ўжо ў лютым кошт такога хлеба вырас да 31,5 грыўні ($1,12).

Ва Украіне даражэюць не толькі хлебабулачныя вырабы, але і іншыя прадукты. Напрыклад, усяго за год «набор для баршчу» падаражэў у два разы.

Таксама паведамлялася, што цэны на алей ва Украіне за год выраслі на 85,5 працэнта і, згодна з меркаваннем экспертаў, прадоўжацца расці.

Згадваючы класіка

# «Я ПРЫЙШОЎ ДЗЕЛЯ ВАС...»

**У 1946-м у «Маім запавеце» класік беларускай літаратуры Якуб Колас пісаў: «Я прыйшоў у жыццё не дзеля сябе самога, я прыйшоў дзеля вас». Менавіта гэтыя словы і былі ўзятыя для назвы круглага стала, які прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы, дзе прэзентаваліся мерапрыемствы, запланаваныя Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа, Нацыянальнай бібліятэкай і Цэнтралізаванай сістэмай дзяржаўных публічных бібліятэк горада Мінска.**





### КВЭСТЫ, МУЗЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ, ТЭАТРАЛЬНЫЯ ВЕЧАРЫ...

Калектыў літаратурна-мемарыяльнага музея імкнецца зрабіць дом Коласа прывабным і цікавым кожнаму.Тут заўсёды багата гасцей. У музеі прымаюць у першакласнікі, адзначаюць выпускныя, дні нараджэння, і нават маладыя ў дзень вяселля заязджаюць сюды на святочную фотасесію.

Малыя дзеткі тут могуць паглядзець спектаклі, створаныя па матывах народных казках, апрацаваных Коласам, альбо паўдзельнічаць у разнастайных майстар-класах. Старэйшыя школьнікі актыўна ўключаюцца ў квэсты і музейныя заняткі, прысвечаныя творчасці класіка. Моладзь можа завітаць на музычныя і тэатральныя вечары.

На юбілейны год запланаваны літаратурныя сустрэчы, прэзентацыі творчых сем'яў, выставы, падчас якіх можна даведацца пра малавядомыя факты з жыцця Коласа.

— Мы стараемся паказаць Коласа з розных бакоў: як настаўніка, дзяржаўнага дзеяча, навукоўца. Але галоўнае, каб людзі маглі ўбачыць і простага чалавека з яго штодзённымі клопатамі, радасцямі і перажываннямі,— падзяліўся **старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Аляксандр КРЫЖЭВІЧ**. Таму, калі першы паверх задзейнічаны пад пастаянную і часовыя экспазіцыі, на другім, мемарыяльным, захоўваецца атмасфера, якая была пры жыцці пісьменніка. У гасцёўні, сталовай і рабочым кабінеце можна ўбачыць рэчы, якія належалі сям'і Міцкевічаў.

Гасцей запрашаюць у падарожжа і па іншых адрасах Коласа. Дзякуючы віртуальнай рэканструкцыі можна паглядзець вуліцы, дамы, парк і стадыён 1930-х гадоў, а таксама дом, дзе жыў пісьменнік. Калі ў яго зазірнуць праз акенца веранды, відаць глобус і стрэльбу на сцяне — гэта напамін пра сярэдняга сына пісьменніка, Юрку, які цікавіўся геаграфіяй і любіў паляўнічыя паходы.

Акрамя традыцыйных экскурсій і лекцыйных заняткаў, музей прапануе адкрываць звесткі з біяграфіі класіка пры дапамозе настольнай гульні «Жыццё па Коласу». Трэба толькі кінуць кубік і прасунуцца на пэўную колькасць хадоў. Кожны пункт — рэальныя факты з жыцця пісьменніка.

Задзейнічана будзе і прастора побач з домам. Дарэчы, ужо стала традыцыяй загадваць жаданні каля дрэў, пасаджаных дзядзькам Якубам. Кажуць, яны здзяйсняюцца.

Супрацоўнікі ўстановы плануюць актыўна данасіць слова Коласа і за межамі музея — яны гатовыя выязджаць у розныя гарады і праводзіць музейна-педагагічныя заняткі.

Гасцей чакаюць таксама філіялы на Стаўбцоўшчыне. Экскурсіі па мемарыяльных і літаратурных экспазіцыях дапоўняць пешыя і веласіпедныя вандроўкі «Акінчыцы—Альбуць—Смольня», паходы выхаднога дня «Свет раслін на службе сям'і», інтэрактыўныя гульні.

Музей ужо падпісаў пагадненні аб супрацоўніцтве з бібліятэчнымі ўстановамі. Так, на базе сталічнай бібліятэкі № 7 імя Якуба Коласа будзе ладзіцца праект «Коласаўскія размалёўкі». Ідэю пазычылі ў калег з Піцера, дзе падобныя работы ствараюцца па творчасці Дастаеўскага. Пры дапамозе малюнкаў і цытат з «Новай зямлі» наведвальнікаў будуць зацікаўліваць творчасцю класіка.

### У ЯГО КНІЖНАЙ СПАДЧЫНЕ — ГІСТОРЫЯ НАШАГА МАСТАЦТВА

У юбілейны год шэраг мерапрыемстваў правядзе і Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь.

У фондах бібліятэкі зберагаецца багатая спадчына класіка. Установа валодае фактычна ўсімі публікацыямі Коласа, прыжыццёвымі і пасмяротнымі. Тут захоўваюцца арыгіналы газет і часопісаў, у якіх друкаваліся першыя вершы пісьменніка. Ёсць выданні, якія ўбачылі свет у 1930-я гады на тэрыторыі Заходняй Беларусі (так, Колас аб'ядноўваў беларусаў, якія пасля Рыжскага міру аказаліся па розных баках граніцы. Дзіўна, але творы пісьменніка з савецкай часткі друкаваліся на тэрыторыі, аддадзенай Польшчы). Захоўваюцца кнігі, якія класік напісаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Сёння багатая кніжная спадчына Коласа, сабраная ў бібліятэцы, налічвае сотні выданняў. Калі пагартаць іх старонкі ад самых ранніх, што афармляліся Карусём Каганцом, да сучасных, можна прасачыць гісторыю беларускага мастацтва. За афармленне твораў Коласа браліся народныя мастакі. Дарэчы, у бібліятэцы асобна захоўваюцца і мастацкія работы, створаныя па творах класіка. Напрыклад, вялікую калекцыю сваіх работ перадаў Георгій Паплаўскі.

Таксама ў бібліятэцы зберагаецца шэраг дакументаў, у тым ліку аўдыёвізуальных. Толькі нотных лістоў, дзе творы Коласа ляглі ў аснову, у фондах больш за дзве сотні.

Па творчасці народнага пісьменніка абараняліся кандыдацкія і доктарскія работы, у тым ліку даследчыкамі за межамі нашай краіны. Адных аўтарэфератаў дысертацый бібліятэка мае звыш 40.

Яшчэ не паказваліся шырокай публіцы некаторыя кнігі з аўтографамі пісьменніка, яго ліставанне з іншымі творцамі. Ёсць у фондах Нацыянальнай бібліятэкі і рэдкія фотаздымкі Коласа (з унукамі, пісьменнікамі, чытачамі), напрыклад, фотапартрэт, зроблены сто гадоў таму, калі Колас вярнуўся ў Беларусь пасля вымушанай з-за Першай сусветнай вайны эміграцыі, альбо яшчэ больш ранні здымак 1907 года, дзе малады Міцкевіч танцуе са сваім сябрам.

Сярод рарытэтаў — вершы з праўкамі: рэдактарскімі ці зробленымі самім Коласам.

Усё гэтае багацце будзе выкарыстана ў падрыхтоўцы юбілейных мерапрыемстваў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Бяспека

# Рыфма для жыцця

## Бабруйскія ратавальнікі будуць змагацца за бяспеку яшчэ і «запамінанкамі»

**Бабруйчане зноў вызначыліся сваёй вынаходлівасцю. Супрацьпажарную барацьбу вырашана весці цяпер не толькі «прозай», але і... вершамі. На думку спецыяліста сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Уладзіміра Бутко, паэтычны варыянт слоўнай прафілактыкі больш эфектыўны, бо хутчэй запамінаецца.**

— Мы шмат расказваем насельніцтву пра тое, чаго нельга рабіць, але даносім карысны досвед у павучальнай форме. Гэта, на жаль, не заўсёды застаецца ў памяці, — аргументуе ён. — У паэтычным варыянце наогул няма лішніх слоў, адна канкрэтыка. Прычым без навязвання і патрабаванняў. Выключна сяброўскія пажаданні. Напрыклад, «Дроў запас ля печкі / Ніколі не трымай, / Гэта небяспечна — / Ты не забывай. / Калі будзеш грэцца, / Дом можа загарэцца». Або: «Гэта ведае і кошка, / Што пра нас тут гаварыць. / Перад тым як легчы ў ложак, / Дровы ў печцы — не паліць». А такое папярэджанне, мне здаецца, у крытычную хвіліну ўспомніцца хутчэй: «Каб без дома не застацца, / У мабільнік запішы: / «Сто адзін» і «сто дванаццаць» / Пры пажары набяры».

— Тыя падыходы, якія мы выкарыстоўваем, ужо крыху прыеліся людзям, — дадае прапагандыст Бабруйскага гаррайаддзела Яўген Тоўсцік. — Будзем паралельна выкарыстоўваць больш жывыя формы. Напрыклад, малюнак печкі, у якой гараць дровы, з адкрытымі дзверцамі — і наша вершаванае папярэджанне. З гумарам і па сутнасці.

На ўзбраенні бабруйскіх ратавальнікаў — больш за дваццаць вершаваных «запамінанак».

Зарыфмаваць правілы бяспекі бабруйчанам дапамог сябар Уладзіміра Бутко — Валяр'ян Чарняцоў. Тэмы розныя, ад неабходнасці карыстацца пажарным апавяшчальнікам, які дапаможа зберагчы дабро, да пажаданняў дачнікам, каб не забываліся на зіму адключаць на сваіх лецішчах электрычнасць.

У Бабруйскім гаррайаддзеле спадзяюцца, што новы спосаб прапаганды дапаможа папярэдзіць шмат няшчасцяў. Толькі наконт печкі ёсць некалькі вершаваных напамінаў — што нельга паліць у ёй пры адкрытых дзверцах, высыпаць попел каля дома, неабходна своечасова чысціць ад сажы дымаход і гэтак далей.

— У будучым збіраемся зрабіць буклеты і пусціць у народ, — дзеліцца суразмоўнік. — Калі гэта спрацуе, працягнем удасканальваць нашы вершаваныя рэкамендацыі. Спадзяёмся, што асаблівы поспех гэта будзе мець сярод дзяцей, якія ўсё ловяць на лету. Яны ж данясуць карысную інфармацыю і да дарослых. Вельмі шмат няшчасцяў здараецца, калі людзі робяць нешта, не задумваючыся. Той жа попел высыпаюць каля дома, а потым крычаць: ратуйце! Была справа: выязджалі на пажары, спраўкаваныя тым, што ўнутры электралічыльнікаў стаялі жучкі і нават адвёрткі. Ёсць зарыфмаваныя радкі і на гэты конт. Некаторыя людзі сапраўды не разумеюць, наколькі такія справы небяспечныя і рызыкоўныя. Магчыма, нашы «запамінанкі», якія нагадваюць народныя прыпеўкі, прыжывуцца і неяк паўплываюць на бескапотных грамадзян.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Альма-матар

# ПРАФЕСІЯ ПРАВААХОЎНІКА — ЗАПАТРАБАВАНАЯ

## Абітурыенты з усіх рэгіёнаў краіны наведалі Акадэмію МУС

**У галоўнай міліцэйскай ВНУ падчас дня адчыненых дзвярэй таксама пабывалі іх бацькі і настаўнікі. Некаторыя прыехалі цэлымі сем'ямі, класамі, у кампаніі сяброў.**

Гасцям не толькі расказалі пра работу праваахоўнікаў, а і прадэманстравалі некаторыя аспекты іх дзейнасці. Пункты дактыласкапіі, фіксацыі слядоў злачынства, складання фотаробата, выстаўка ўзбраення і спецыяльных сродкаў, шматлікія прыборы і прыстасаванні — прадстаўнікі кафедраў і курсанты акадэміі ледзь паспявалі адказваць на шматлікія пытанні, а таксама паказваць, як усё ўладкавана.

Асаблівая ўвага наведвальнікаў была накіравана на тэхніку. Фатаграфавалі, разглядалі, нават ацанілі яе знутры. Карыстаўся папулярнасцю і стэнд форменнай экіпіроўкі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

Тэматычныя пляцоўкі падчас дня адчыненых дзвярэй таксама арганізавалі Следчы камітэт і Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз — у тым ліку для гэтых, а таксама іншых сілавых ведамстваў Акадэмія МУС рыхтуе спецыялістаў.

Абітурыенты атрымалі паўнавартасную інфармацыю аб парадку паступлення, медыцынскіх патрабаваннях, навучальным працэсе, а таксама далейшай службе афіцэраўвыпускнікоў. На пытанні, якія ўзніклі ў наведвальнікаў, падрабязна адказалі прадстаўнікі міліцэйскай ВНУ.

Кіраўнік установы расказаў аб тым, чым сёння з'яўляецца акадэмія, якой матэрыяльнатэхнічнай базай валодае, наколькі моцны тут прафесарска-выкладчыцкі састаў, а таксама ці кожны можа быць супрацоўнікам органаў правапарадку. **Начальнік Акадэміі МУС генерал-маёр міліцыі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ** падкрэсліў, што асноўныя патрабаванні да кандыдатаў — дакладнае жаданне служыць у праваахоўнай сістэме, быць адданымі свайму народу і дзяржаве, а таксама адпавядаць усім дзелавым якасцям, якія прад'яўляюцца да сучаснага супрацоўніка.

Прафесія праваахоўніка карыстаецца папулярнасцю ў сучаснай моладзі. Прычым сярод жадаючых насіць афіцэрскія пагоны нямала і дзяўчат. Штогод апошнія папаўняюць шэрагі курсантаў і ні ў чым не саступаюць хлопцам: ні ў вучобе, ні ў фізічнай падрыхтоўцы.




Нагадаем, у Акадэмію МУС прымаюцца ўчарашнія школьнікі, грамадзянская моладзь ва ўзросце ад 17 да 25 гадоў, а таксама супрацоўнікі органаў унутраных спраў да 30 гадоў. Для таго каб паступіць у міліцэйскую ВНУ, неабходна звярнуцца ў тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў да 15 красавіка і напісаць заяву. Што рабіць далей, вас абавязкова праінфармуюць.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота прэс-службы Акадэміі МУС.**

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

## НЕ ПРАПУСЦІЦЕ!

### Як зразумець, што ў вас рак на ранняй стадыі?

**Асаблівасць і каварства гэтай хваробы ў тым, што на ранняй стадыі, асабліва на першай, яна не непакоіць. Чалавек не адчувае болю, недамагання, у яго добрыя аналізы крыві, і ён вядзе актыўны лад жыцця.**

Аднак ёсць пухліны, якія заўважыць даволі проста. Гэта так званы рак візуальных лакалізацый — пухліны галавы, шыі, скуры, мяккіх тканак. Іх можна прапальпіраваць ці ўбачыць.

— Убачыць самому — гэта добра, але лепш паказаць спецыялісту. Анколаг і звычайны чалавек крыху па-іншаму глядзяць на рэчы. Часам здаецца, што на скуры бяскрыўдная плямка, а спецыяліст паглядзіць, і аказваецца, што зусім не бяскрыўдная. І, наадварот, чалавек пакутуе, носіцца і паказвае кожную радзімку, падазраючы меланому, а спецыяліст паглядзіць і кажа, што ўсё нармальна, — гаворыць **загадчык кафедры анкалогіі БелМАПА Аляксандр ЖУКАВЕЦ**.

На што яшчэ варта звярнуць увагу? На з'яўленне крывяністых выдзяленняў ці крыві ў біялагічных вадкасцях — макроце, сліне, мачы або кале. У такім выпадку варта абавязкова паказацца спецыялісту. Калі маецца працяглы кашаль, які ніяк не лечыцца і прычыны яго незразумелыя, таксама варта звярнуцца да ўрача.

— Нягледзячы на тое што скрынінгавыя праграмы развіваюцца і будуць развівацца, не трэба ігнараваць прафілактычныя агляды. Усю краіну ахапіць скрынінгам немагчыма, таму калі ў вас ёсць магчымасць прайсці медагляд (а для многіх прафесій гэта абавязкова), то трэба гэта зрабіць. І не забываць, што ёсць пярвічная прафілактыка. Зразумела, не хочацца, але гэта адзін са шляхоў зніжэння захваральнасці і смяротнасці, — рэзюмуе Аляксандр Жукавец.

Падчас скрынінгавых праграм у людзей, якія не маюць скаргаў і лічацца здаровымі, злаякасныя пухліны выяўляюцца прыкладна ў 0,5 %, а гэта пяць чалавек з тысячы.

А вы ведалі?

# КАРАНАВІРУС СУПРАЦЬ АНКАЛОГІІ

## Ці ёсць супрацьпаказанні ў анкалагічных хворых да прышчэпкі ад COVID-19?

**Анкалагічных пацыентаў прынята адносіць да катэгоры рызыкі павышанай смяротнасці ад COVID-19. Аднак, як тлумачыць намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей КРАСНЫ, павышаная смяротнасць характэрная толькі для анкалагічных пацыентаў паміж 30 і 40 гадамі. Для гэтага ўзросту характэрныя вельмі спецыфічныя і агрэсіўныя пухліны, якія ўздзейнічаюць на імунную сістэму.**

Ва ўсіх астатніх катэгорый анкапацыентаў прыкладна такая ж смяротнасць, як і ў людзей без злаякасных новаўтварэнняў, акрамя пацыентаў з 4-й стадыяй. У апошніх імунная сістэма працуе вельмі напружана, і рэзервы арганізма абмежаваны.

— Пры гэтым мы ведаем, што пры некаторых злаякасных пухлінах, наадварот, больш спрыяльны ход каранавіруснай інфекцыі. Гэта характэрна для пацыентаў, якія пакутуюць на рак прастаты і атрымліваюць гармоны. Таксама пры некаторых лімфомах — з-за таго, што ў такіх пацыентаў не развіваецца цытакінавы шторм, бо ў іх перабудавана імунная сістэма, — расказвае анколаг.

Што датычыцца прышчэпкі, то само па сабе злаякаснае новаўтварэнне не



з'яўляецца супрацьпаказаннем, тлумачыць Сяргей Красны. Але ёсць невялікае абмежаванне: калі праводзіцца супрацьпухліннае лячэнне — хіміятэрапія, таргетная тэрапія, імунатэрапія, — лепш не вакцынавацца. Прышчэпку варта зрабіць ці да лячэння, ці ў прамежак паміж курсамі. Да кожнага пацыента тут індывідуальны падыход.

Як вядома, высокая тэмпература дапамагае ў барацьбе з анкалагічнымі захворваннямі, бо ракавыя клеткі не пераносяць высокіх тэмператур. Дык ці варта збіваць тэмпературу, напрыклад, пры каранавіруснай інфекцыі?

Як патлумачыў анколаг, уплыў высокіх тэмператур на пухлінныя клеткі быў даўно заўважаны — яшчэ ў тыя даўнія часы, калі падчас эпідэміі чумы зніжалася анкалагічная захваральнасць і нават адбывалася вылечванне пацыентаў са злаякаснымі пухлінамі. Потым гэты кірунак пачаў распрацоўвацца, цікавым ён аказаўся і для беларускіх анкалагаў. Была праведзена вялікая колькасць даследаванняў, агульную гіпертэрмію шырока выкарыстоўвалі для лячэння хіміярэзістэнтных пухлін.

— Пацыента награваюць да 42 градусаў, і праводзіцца хіміятэрапія, прычым у спалучэнні з гіперглікеміяй, калі падымаецца высокі ўзровень глюкозы ў крыві, што таксама ўзмацняе дзеянне хіміяпрэпаратаў. Аднак такое комплекснае лячэнне магчыма толькі пад наркозам, бо чалавек яго не перанясе. У свой час гэта быў адзін з эфектыўных метадаў і мы яго шырока прымянялі. Потым, дзякуючы з'яўленню новых лекавых сродкаў, у тым ліку таргетнай тэрапіі, паказанні да яго звузіліся, — кажа Сяргей Красны. — Гэты метад працягвае прымяняцца, і не толькі ў Беларусі, але і ў многіх краінах свету, у прыватнасці вельмі шырока ў Расіі, Германіі.

Анколаг тлумачыць, што тэмпературу, неабходную для разбурэння пухлінных клетак, чалавек без наркозу вытрымаць проста не зможа.

— Калі 39 яшчэ нейк церпіць, то 42 — гэта занадта. Высокая тэмпература вельмі таксічная для галаўнога мозгу, могуць быць сур'ёзныя наступствы. Таму спецыяльна падчас захворвання трымаць у сябе высокую тэмпературу не варта, яе трэба збіваць, — раіць урач. — Тым часам і высокая тэмпература, і той цытакінавы шторм пры каранавіруснай інфекцыі цалкам можа ўплываць на пухлінныя клеткі, знішчаючы іх, бо яны больш адчувальныя.

# Курэнне, інфекцыі, чырвонае мяса

## Што выклікае рак і як яго прадухіліць?

**Паводле анкалагічнай базы даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у 2020 годзе ў свеце на рак захварэла 19,3 мільёна чалавек і амаль 10 мільёнаў загінула. Ужо ў 2015 годзе ў 91 краіне са 172 у людзей ва ўзросце ад 18 да 70 гадоў рак быў на першым ці другім месцы сярод прычын смерці, і сёння такая тэндэнцыя захоўваецца. Нягледзячы на тое што з'яўляюцца новыя лекі і падыходы ў лячэнні, чакаецца, што ў 2040 годзе ў свеце будзе дыягнаставана каля 28 мільёнаў выпадкаў раку — у кожнага пятага мужчыны і жанчыны ва ўзросце да 75 гадоў. У кожнага восьмага мужчыны і 11-й жанчыны хвароба акажацца смяротнай.**

### БЕЛАРУСКІЯ АНКОЛАГІ АДЗНАЧАЮЦЬ ЗНІЖЭННЕ ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ

У Беларусі ў апошнія два гады адбылося рэзкае зніжэнне анкалагічнай захваральнасці, у 2020-м, напрыклад, адразу на 25 %. Тады беларускія анколагі выявілі каля 43 тысяч новых выпадкаў раку пры тым, што ў 2019-м было 54,5 тысячы ўпершыню захварэлых і ў 2020-м адпаведна чакалася 55-56 тысяч новых выпадкаў.

— Гэта экстраардынарная сітуацыя, бо раней на працягу ўсяго перыяду назіранняў (больш за 50 гадоў) адзначаўся толькі рост, — кажа **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей КРАСНЫ**. — Мы вырашылі, што падчас пандэміі людзі проста не звярталіся па медыцынскую дапамогу. Таму, натуральна, у 2021 годзе чакалі рэзкага ўсплёску анкалагічнай захваральнасці, пацыентаў з запушчанымі пухлінамі.

Аднак і ў 2021 годзе росту не адбылося. Згодна з папярэднімі данымі, летась быў дакладна такі ж узровень захваральнасці, як у 2020-м. Сумарна за два гады колькасць новых выпадкаў раку знізілася на 25 тысяч.

— Мы прааналізавалі сітуацыю па стадыях хваробы — аказалася, што адбылося раўнамернае зніжэнне. На 1 % знізілася выяўленне на першай стадыі, на столькі ж павялічылася на чацвёртай. Звязана гэта, верагодна, з некаторым змяншэннем праграм скрынінгу, падчас якога і выяўляецца першая стадыя. Рэзкага павелічэння чацвёртай стадыі няма, — кажа Сяргей Красны. — Хутчэй за ўсё сама каранавірусная інфекцыя ўплывае на анкалагічную захваральнасць. Мы такую гіпотэзу выказалі, але для яе пацвярджэння неабходна некалькі гадоў. Мяркую, што адказ атрымаем гады праз два.

Смяротнасць ад злаякасных новаўтварэнняў сёлета таксама знізілася. На працягу апошніх дзесяці гадоў яна трымалася прыкладна на адным узроўні, вагаючыся ў межах 1 %, што на фоне штогадовага росту захваральнасці было вельмі добрым паказчыкам. У 2021 годзе смяротнасць ад злаякасных пухлін знізілася адразу на 3 %, а гэта каля 600 чалавек. У наступныя гады, паводле меркавання анколагаў, смяротнасць мусіць знізіцца яшчэ больш.

### ФАКТАРЫ РЫЗЫКІ, ЯКІХ МОЖНА ПАЗБЕГНУЦЬ

— Расслабляцца асабліва не трэба, бо прычыны зніжэння захваральнасці яшчэ будуць высвятляцца. Паводле анкалагічнай базы даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у развітых краінах захваральнасць расце і будзе расці, — адзначае **загадчык кафедры анкалогіі БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Аляксандр ЖУКАВЕЦ**. — Таму важная пярвічная прафілактыка раку, асноўная мэта якой — зніжэнне захваральнасці. Спецыяльных супрацьракавых дыет ці практыкаванняў няма. Але ёсць фактары, пра якія добра вядома, і іх выключэнне з нашага жыцця дазволіць знізіць захваральнасць. Прыкладна да 30 % злаякасных захворванняў можна пазбегнуць. Іншая справа, што прафілактыка — справа доўгая, па сутнасці, гэта ўсё жыццё, патрабуе ўнутранага напружання, а мы гэтага не любім.

Паводле амерыканскіх даследчыкаў, прыкладна 42 % злаякасных захворванняў звязана з фактарамі рызыкі. На першым месцы сярод іх курэнне, з ім звязаны шэраг пухлін. Гэта рак лёгкага (каля 60 %), гартані, слізістай поласці рота, мачавога пузыра, ныркі. З курэннем звязана каля 40 % выпадкаў смерцяў ад раку, бо ў такіх новаўтварэнняў, на жаль, вельмі дрэнны прагноз. Злоўжыванне ўльтрафіялетавым выпраменьваннем або загарам вінаватае ў 6 % злаякасных выпадкаў, найперш меланомы.

З лішняй вагой асацыіравана каля 5 % раку. Гэта 5 % злаякасных утварэнняў у мужчын і 11 % усіх новаўтварэнняў у жанчын. Лішнія кілаграмы з'яўляюцца прычынай каля 30 % раку стрававода, 15 % раку малочнай залозы, 60 % раку цела маткі, да 30 % раку ныркі і да 40 % раку тоўстай кішкі. Каля 5 % злаякасных пухлін звязана з ужываннем алкаголю: доза, якая перавышае 40 грамаў у суткі, з'яўляецца канцэрагеннай.

Анкалогію выклікае і шэраг інфекцый. У прыватнасці, каля 30 % раку страўніка звязана з бактэрыяй «хелікабактар пілоры». Цяпер захворванне на рак страўніка ў нашай краіне, як і ва ўсім свеце, зніжаецца, бо змяніліся стэрэатыпы паводзін: людзі сталі выкарыстоўваць больш свежыя прадукты, ужываць больш гароднiны і фруктаў. Яшчэ адна інфекцыя — вірус папіломы чалавека анкагенных штамаў — з'яўляецца прычынай раку шыйкі маткі ў 85 % выпадкаў.

Таму асноўная прафілактыка — адмова ад тытуню, алкаголю, лячэнне інфекцый, зніжэнне вагі і фізічная актыўнасць.

— У значнай колькасці пацыентак можна пазбегнуць развіцця раку шыйкі маткі, калі яны будуць вакцынаваны адпаведнай вакцынай. Па раку печані прыкладна палова выпадкаў звязана з наступствамі гепатыту В і С. Ад гепатыту В ёсць прышчэпка, ад С — пакуль няма, але ёсць адэкватнае лячэнне. Па харчаванні таксама добра вядомы фактары, якія ўплываюць на развіццё злаякасных новаўтварэнняў. Гэта частае ўжыванне чырвонага мяса (свініна, бараніна, ялавічына), няважна, у якім выглядзе. Гэта не значыць, што мяснымі прадуктамі харчавацца не трэба, але мы імі крыху злоўжываем, — адзначае Аляксандр Жукавец.

Ёсць сувязь паміж ракам малочнай залозы, які ў структуры жаночай захваральнасці займае першае месца, і нараджэннем дзяцей. Адно дзіця, якое жанчына нарадзіла да 30 гадоў, зніжае рызыку развіцця раку малочнай залозы на 7 %, грудное кармленне — яшчэ на 4 %.

У агульнай анкалагічнай захваральнасці (сярод мужчын і жанчын) на першае месца ў нашай краіне выйшаў рак тоўстай кішкі, і гэтым Беларусь адрозніваецца ад усіх суседніх краін. Гэта звязана з няправільным харчаваннем: мы ўжываем вельмі мала гароднiны і фруктаў, што адразу адбіваецца на функцыі кішэчніка. Акрамя таго, гэта звязана і з нізкім узроўнем прафілактыкі раку тоўстай кішкі — беларусы рэдка робяць прафілактычную скрынінгавую каланаскапію.

— Падчас каланаскапіі выяўляюцца паліпы, з якіх у будучыні можа развіцца рак, і яны выдаляюцца. З дапамогай такой каланаскапіі можна папярэдзіць 80 % выпадкаў раку тоўстай кішкі. Яе дастаткова праходзіць адзін раз на 10 гадоў, пачынаючы з 50. Калі ёсць блізкія сваякі, у якіх быў рак тоўстай кішкі, пачынаць варта ў 40—45 гадоў, — раіць Сяргей Красны.

Лядовая сімфонія

# ЧАТЫРЫСТА «КВАДРАТАЎ» ЗДАРОЎЯ

**Некалькі гадоў таму дваровы лядовы рух літаральна захапіў маладыя мікрараёны актыўнай жыллёвай забудовы ў Гомелі. Дарослыя з вокнаў шматпавярховікаў са шлангаў залівалі каткі, а пасля разам даглядалі іх. Усё для таго, каб дзеці не сядзелі па кватэрах, а вучыліся катацца на каньках, захапіліся хакеем. Атрымалася! Лёд гарэў, а двор поўніўся не толькі дзіцячым гоманам, але і радасным смехам бацькоў, што часцей сталі выходзіць на прагулкі з малымі. Таты аблюбавалі каток увечары — не горш за дзяцей рэзалі лёд у дваровых лядовых баталіях.**

Арсеній Анціпаў — не гарадскі, вясковец. На звычайнай вуліцы ў Старой Беліцы, што пад Гомелем, яму ўдалося зрабіць лядовую пляцоўку не горшую, чым у гарадскім двары. Праўда, знайсці аднадумцаў на шляху да сваёй ідэі яму не ўдалося. Рабіў каток сам. Сіл і імпэту ў задуме надала падтрымка жонкі Яны і двух сыноў — васьмігадовага Станіслава і чатырохгадовага Марка.

— Каток нараджаецца не з відэа на «Ютубе», а з агеньчыка ў сэрцы, — шчаслівы бацька, муж, галоўны завадатар актыўнага жыцця маладой сям'і Арсеній Анціпаў дзеліцца ўласным вопытам стварэння вясковай лядовай арэны. — Я для сябе ўсвядоміў — не абавязкова патрэбна глабальная мэта, важныя нават маленькія крокі да сціплай мары. Мая мара — каб мае хлопцы раслі дужымі, здаровымі. Важна для нас з жонкай, і каб нашы дзеці нечым сапраўды цікавіліся.

Пад каток Арсеній спачатку думаў адвесці частку свайго прысядзібнага ўчастка. Пасля прыйшла ідэя зрабіць лядовую пляцоўку даступнай для ўсіх, хто захоча катацца.

— Перад нашым домам даволі вялікі ўчастак, які мы звычайна добраўпарадкоўваем: пасеялі газон, косім яго. Тут і вырашыў заліваць каток. Увогуле месца атрымалася добрае. Каток глядзіць на самы цэнтр вёскі, побач клуб, магазін, мемарыяльны комплекс, старажытная царква Міколы Цудатворца — нашы вясковыя славутасці, — тлумачыць Арсеній.

Ідэі, як зрабіць каток, браў зролікаў у інтэрнэце, інфармацыі хапае. Але ўсё роўна пэўная неспрактыкаванасць дала аб сабе знаць. Кажа, што ёсць жаданне ўдасканаліць падыходы да стварэння лядовай пляцоўкі.

— Пляцоўку пад каток трэба як мага лепш падрыхтаваць, мінімізаваць па магчымасці нахіл паверхні. Калі не папрацаваць над папярэдняй падрыхтоўкай участка, то працэс заліўкі катка запатрабуе больш намаганняў, і можа з'явіцца спакуса кінуць гэту справу, — папярэджвае Арсеній.

Пляцоўка пад каток у іх выпадку была адносна роўная. Але нават пры мінімальнай пакатасці паверхні, кажа вясковец, падчас заліўкі пляцоўкі прыйшлося прыстасоўвацца да нераўнамернага разліву вады.

— Вада бярэцца скарынкай нераўнамерна, з'яўляюцца кратары, месцамі вылазіць трава. На будучыню я параіў бы набыць хоць якую-небудзь падкладку, плёнку, — дзеліцца Арсеній.

Па яго словах, гэта асабліва важна для захавання каткоў у нашых умовах надвор'я, калі адлігі мяжуюцца з марозамі. На няткаты «падмурку» такую самаробную лядовую арэну капрызам надвор'я будзе сапсаваць больш складана.

Ахвотным паўтарыць вопыт з катком трэба рыхтавацца да таго, што неабходна знайсці пляцоўку не менш чым на чатырыста «квадратаў». На заліўку пойдзе каля 25 тон вады. Асобна неабходна будзе папрацаваць над «каробкай» для лядовай арэны.

— Вакол нашага катка зрабіў барты са снежных гурбаў. Спачатку, калі снегу выпала няшмат, яго прыйшлося збіраць па ўсёй вуліцы, — з усмешкай прызнаецца Арсеній.

Асобна снегавую заслону яму прыйшлося зрабіць у мэтах бяспекі: агарадзіць такім чынам каток ад абочыны дарогі. Але гаспадар вясковай лядовай арэны пайшоў і далей: каб было зручна катацца ўвечары, пасля работы-вучобы, правёў святло са свайго ўчастка да катка, устанавіў дадатковы пражэктар, бо вулічнага асвятлення было недастаткова. Папярэджвае вясковец і аб тым, што, каб добра катацца, прыходзіцца шчыра пазавіхацца з лапатай.

— Я выходжу амаль штодня ў пяць-шэсць гадзін раніцы, перад работай, калі ёсць час пачысціць каток. Школьнікі раніцай ідуць праз пляцоўку на аўтобус, які развозіць у школы. Дзеці, гляджу, неяк ацэньваючы глядзяць, як я з лапатай такую зарадку раблю. Мне падаецца, што, асабліва для хлопцаў, гэта добры прыклад таго, як па-мужчынску адказна ставіцца да справы. Таму я і кажу, што сапраўдная лядовая пляцоўка — гэта не пра «я магу», а пра «я хачу». Каб не нараджаліся думкі: а нашто ты чысціш гэты каток, заўтра зноў снег, і паслязаўтра.



Сям'я Анціпавых *(злева)* з сябрамі.

Калі не чысціць пляцоўку, асабліва калі ідзе снег — на ўсёй сваёй справе крыж паставіць, паверхня робіцца ўся ў калдобінах, потым цяжка катацца, непрыемна, — заўважае Арсеній.

Ён папярэджвае: не расказваюць папулярныя ролікі ў сецціве па стварэнні дваровых лядовых арэн для дзяцей, што калі дарослыя не пакажуць прыклад пераадольвання ляноты, малых таксама нішто не заглядне на каток.



Арсеній АНЦІПАЎ штодзень выходзіць на ачыстку лядовай пляцоўкі.

— Зразумей адно: хоць нават зрабі для дзяцей пад домам супердобры каток, нацягні на іх самыя лепшыя канькі, не захочуць яны займацца, калі няма сапраўднай цікавасці ад дарослых, што ў аўтарытэце ў дзяцей, — імкнецца данесці да іншых бацькоў думку малады тата.

Цяпер у сваёй вёсцы Арсеній, на жаль, таксама назірае такую карціну. Упэўнены, дзеці хадзілі б катацца нашмат больш ахвотна, калі б была большая зацікаўленасць ад мам, тат, бабуль, дзядуль. Спадзяецца, што прыклад яго сям'і, сяброў, суседзяў, знаёмых натхніць большую колькасць вяскоўцаў. І іх лёд, як у горадзе, будзе «гарэць» і поўніцца смехам дзяцей і бацькоў.

— Цікава назіраць, як прывыкае стаяць на каньках наш малодшы сынок, яму пакуль цяжкавата. Старэйшы цяпер ужо няблага катаецца, нават «дрыфціць» (дрыфт — тэхніка праходжання паваротаў з выкарыстаннем кіраванага заносу), як ён кажа, — расказвае бацька. — Мару арганізаваць нашу вясковую хакейную каманду. Пакуль жа дзецям, якія хочуць навучыцца катацца, і канькі прапаноўваю.

Між тым, такі актыўны зімовы занятак, упэўнены Арсеній, асабліва важны для бацькоў на вёсцы. Бо сапраўды, не навозіш на гарадскія арэны сваіх дзяцей, а тут побач выдатная магчымасць, як адцягнуць іх ад гаджэтаў, падцягнуць здароўе, загартаваць волю да пераадолення.

— Мы ўвогуле імкнёмся актыўна адпачываць з сям'ёй. З групай аднадумцаў-аматараў здаровага спосабу жыцця ездзім катацца на снаўбордах, лыжах, бяром удзел у спаборніцтвах, грамадскіх веласабегах, марафонах, — расказвае галава сям'і Анціпавых. — Пытанне для кожнага: ці гатовы ён не толькі зайздросціць такой актыўнасці, але і пачаць сам нешта рабіць у гэтым кірунку. Таму я і кажу, што важныя ў гэтым працэсе любыя маленькія крокі. Ад сябе раю шукаць матывацыі і жыццёвага імпэту ў сваіх любімых людзях.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва герояў.**

Увага: конкурс!

# КАБ ПАДТРЫМАЦЬ САМЫХ ДБАЙНЫХ

## Спаборніцтва грамадзянскіх ініцыятыў аб'яўлена ў Гродне

**Сёлета конкурс прысвечаны Году гістарычнай памяці. На разгляд будуць прымацца праекты, скіраваныя на захаванне і папулярызацыю гісторыі беларускай дзяржавы і беларускага народа, развіццё роднага краю.**

Як паведамілі ў абласным Савеце дэпутатаў, фінансаванне — з абласнога бюджэту. На рэалізацыю кожнага праекта выдзяляецца ад 40 да 50 тысяч рублёў. Свае заявы прэтэндэнты змогуць накіроўваць арганізатарам — Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Ад Гродна павінны быць прадстаўлены два праекты і па адным з кожнага раёна. Па словах **галоўнага спецыяліста абласнога Савета дэпутатаў Арцёма САБКО**, тэматыка можа быць звязана з мемарыялізацыяй гістарычных месцаў альбо помнікаў знакамітым людзям, стварэннем новых музеяў ці папаўненнем існуючых экспазіцый, вызначэннем гістарычных назваў вуліц, развіццём гуртковай, фальклорнай і рамесніцкай дзейнасці і інш. Рэалізацыя праектаў разлічана на 2022 год, прыём заявак будзе доўжыцца да канца лютага.

Гэта ўжо другі конкурс, ініцыяваны Гродзенскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў сумесна з Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў. Першы выклікаў шырокі рэзананс. На ім з усёй вобласці было прадстаўлена звыш 100 праектаў. У выніку пераможцамі назвалі 14. Тэматыка датычылася сацыяльнага, эканамічнага і экалагічнага напрамкаў. Людзі клапаціліся аб тым, як добраўпарадкаваць населеныя пункты, стварыць зоны адпачынку, палепшыць інклюзіўныя зносіны. У ліку пераможцаў вызначаны праекты: «Экалагічная сцежка — шлях да ведання прыроды», «Востраў здароўя», «Вытокі», «Любчанскі кірмаш», «Дворык дзяцінства», «Праз рух — да актыўнага даўгалецця» і іншыя. Усе праекты атрымалі фінансавую падтрымку ад Банка развіцця ў памеры 7,5 тысячы рублёў.

Праекты грамадзянскіх ініцыятыў скіраваны на тое, каб людзі падключаліся да работы з мясцовымі органамі ўлады, тым самым выказвалі сваю грамадзянскую пазіцыю, клапаціліся аб малой радзіме. На думку арганізатараў, такі конкурс — важны крок да змяненняў, дзякуючы якім прапановы грамадзян могуць увасобіцца ў жыццё.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КРЭВЕТКІ, СЫР, АНАНАСЫ...

## Купляем прадукты для рамантычнай вячэры на Дзень усіх закаханых

**За акном — зімовая золь, а штодзённыя зводкі аб колькасці захварэлых на ковід не дадаюць пазітыву. Але жыццё працягваецца, а значыць, не будзем забываць аб станоўчых эмоцыях. Якія, як сцвярджаюць медыкі, непасрэдна ўплываюць на сілу імуннай сістэмы. А значыць, варта пашукаць падставы для радасці. Дарэчы, набліжаецца самае рамантычнае зімовае свята — Дзень усіх закаханых.**

Сёлета 14 лютага прыпадае на панядзелак — «дзень цяжкі», ды і ва ўмовах пандэміі ў рэстаран ісці, можа быць, і не варта. Лепш арганізаваць рамантычны вечар дома. Можна, вядома, бурчаць пра тое, што Дзень Святога Валянціна — свята заходнееўрапейскае і ў нашай традыцыі да 1990-х не святкавалася. Можна казаць, што яно «для моладзі». Але сямейныя псіхолагі раяць выкарыстоўваць гэты дзень як нялішнюю нагоду нагадаць сваёй другой палоўцы (ды і сабе): колькі б часу вы ні былі разам — ваша любоў зззяе гэтак жа ярка, як і ў самым яе пачатку.

Такім чынам, гатуем рамантычную вячэру. І лічым яе кошт, паколькі наш няпрості час (нягледзячы на рамантычнасць падставы) настройвае на здаровы прагматызм.

### КУХНЯ АФРАДЫТЫ

Правілы рамантычнай вячэры не прадугледжваюць складаных страў, якія патрабуюць шматгадзіннага стаяння каля пліты — у дадзеным выпадку няма падставы выхваляцца кулінарнымі талентамі. Стома сапсуе вам вечар, а нюансы смаку, цалкам верагодна, застануцца незаўважанымі. Акрамя таго, рамантычная вячэра павінна быць лёгкай. З іншага боку, гэтыя ж правілы прадугледжваюць, акрамя прыгожай сервіроўкі (дзе традыцыйна фігуруюць запаленыя свечкі), наяўнасць на стале прадуктаў, якія называюць афрадызіякамі, — то-бок такіх, што ўзмацняюць любоўнае прыцягненне.

> **«Рамантычная вячэра павінна быць бялковай — інакш кажучы, досыць лёгкай і пры гэтым сытнай».**

Прыродныя афрадызіякі вядомыя чалавецтву спрадвеку — згадкі пра іх сустракаюцца нават на шумерскіх клінапісных таблічках. Сучасная навука, зрэшты, не пацвярджае цудадзейнага ўплыву пэўных прадуктаў харчавання на наша лібіда. Дыетолагі падкрэсліваюць, што імгненнага эфекту ад прадуктаў-афрадызіякаў чакаць не варта. Затое кажуць пра тое, што некаторыя стравы (а дакладней, рэчывы, якія яны пастаўляюць у арганізм), сапраўды здольныя расслабляць сценкі сасудаў і паляпшаць кровазварот, павялічваць адчувальнасць скурных покрываў і слізістых, удзельнічаць у сінтэзе мужчынскіх і жаночых палавых гармонаў, праганяць дрымотнасць і павышаць узровень энергіі.

Але для пачатку спынімся на тых прадуктах, якія хоць і асацыіруюцца з рамантычнай вячэрай, але на самай справе не валодаюць той здольнасцю настройваць на любоўны лад, якую ім прыпісваюць. І пачнём з ***шакаладу***. Галоўны атрыбут любых рамантычных спатканняў, аказваецца, не мае нейкіх асаблівых уласцівасцяў, каб дапамагчы павярнуць думкі чалавека ў рэчышча кахання і рамантыкі. Шакалад паляпшае памяць, падтрымлівае сардэчную мышцу і павышае выпрацоўку серататніну, але на палавую функцыю чалавека на практыцы не ўплывае, адзначаюць дыетолагі. Акрамя таго, ён досыць каларыйны (асабліва малочны і з напаўняльнікамі) і ў вялікіх колькасцях здольны выклікаць хутчэй ляноту і дрымотнасць, чым чаканую «жвавасць». Дык што ж, адмовіцца ад шакаладу падчас рамантычнай вячэры? Зразумела, не! Бо любыя афрадызіякі ўздзейнічаюць не толькі (і не столькі) на ўзроўні біяхіміі. Іх уздзеянне — у першую чаргу псіхалагічнае. З рамантычнай вячэрай у свядомасці сучаснага чалавека асацыіруюцца пэўныя прадукты, а таксама экзатычныя і вострыя стравы. І гэта важна ўлічваць. Акрамя таго, адзначаюць псіхолагі, у многіх ёсць свае «асабістыя афрадызіякі» — стравы або прадукты, чые смак і пах звязаныя ў свядомасці дадзенага канкрэтнага чалавека з яркім рамантычным вопытам. Такія афрадызіякі сапраўды здольныя (дзякуючы ўспамінам, якія яны выклікаюць) узмацніць рамантычны настрой.

Такім чынам, шакалад: выбіраем чорны — згодна з традыцыяй, ён больш вытанчаны і больш падыходзіць для рамантычнай вячэры. Да таго ж ён больш карысны. 90 г горкага беларускага шакаладу абыдуцца ў суму ад рубля 49 капеек да рубля 70 капеек. Расійскі цёмны такой жа масы — ледзь даражэй за два рублі, цёмны шакалад вытворчасці Германіі — 3 рублі 16 капеек.

Славу магутнага афрадызіяку прынята прыпісваць ***вустрыцам*** (па легендзе, іх штодня еў на сняданак Казанова). На практыцы вустрыцы ўтрымліваюць цынк (неабходны мужчынскаму арганізму для здароўя і даўгалецця), а таксама амінакіслоты і «гармон добрага настрою» серататнін, але асаблівага ўплыву на павышэнне лібіда (калі верыць сучасным даследаванням) страва не аказвае. Так што з рамантычнага меню іх можна выкрасліць — і гэта добра. Бо такія прысмакі надзвычай дарагія ў нашай зусім не марской дзяржаве. З азнаямленчай мэтай скажам, што на вустрыцы цяпер, аказваецца, сезон; традыцыйна купляюць іх па 12 штук (хоць можна пры жаданні купіць і адну-дзве), і каштуюць яны ў залежнасці ад вытворцы і памеру ад 5,50 да 16,5 рубля за штучку. З аднаго боку — дарага і наконт «смачна» можна спрачацца, з другога — калі вельмі хочацца... «На блюде устрицы во льду» — адчуй сябе Ахматавай.

***Мёд*** таксама здаўна лічылі магутным афрадызіякам — і бычцам бы дарэмна. Нягледзячы нават на выраз «мядовы месяц», на лібіда мёд не ўплывае. Праўда, умацоўвае імунітэт — так што можна пакінуць яго на стале 14 лютага выключна ў якасці супрацьэпідэмічнай меры. Каштуе мёд сёння ў межах 10 рублёў за паўкіло, аптымальна дадаваць яго ў пікантныя салатныя запраўкі. Напрыклад, у салат з цяпер модным у дыеталагаў авакада.



***Авакада*** афрадызіякам лічыў Людовік XIV. Менавіта з часоў караля-сонца ўзнік міф, што авакада абуджае любоўны запал. Па факце, фрукт змяшчае магній і калій для сэрца і тлустыя кіслоты для маладосці скуры, але на палавую фукнцыю ўплыву не аказвае. Хоць выглядае прываблна і экзатычна, а стравы з ім сытныя і пры гэтым не занадта цяжкія для стрававальнай сістэмы. Свежыя авакада ў сярэднім абыдуцца ад 8 з паловай да 13 рублёў за кіло (адзін фрукт сярэдняга памеру будзе каштаваць рублі тры).

І, зразумела, рамантычная вячэра падаецца немагчымай без келіха віна (часцей — чырвонага або шампанскага). ***Чырвонае віно*** лічыцца моцным афрадызіякам. У невялікіх дозах добрае чырвонае віно здымае стрэс і нервовае напружанне, разнявольвае і паляпшае настрой. Але расслабляльнае ўздзеянне любога алкаголю кароткачасовае, пасля чаго няэменна надыходзіць спад сексуальнай актыўнасці. Віно прадстаўлена сёння ў настолькі шырокім цанавым дыяпазоне, што, мабыць, тут усё вельмі індывідуальна.

### ВЯЧЭРА АД ВАЛЯНЦІНА

Дык якія прадукты сапраўды здольныя настройваць на рамантычны лад? Аказваецца, іх даволі шмат. І далёка не ўсе яны экзатычнага паходжання. Напрыклад, афрадызіякам з'яўляюцца ***грыбы*** (дзякуючы высокаму ўтрыманню бялку і цынку). Найбольш эфектыўнымі прынята лічыць, зразумела, арыстакратычныя труфелі, але наогул усе грыбы з'яўляюцца афрадызіякамі. Лідзіруюць у гэтай сферы звыклыя маслякі, апенькі, смаржкі і рыжыкі. 300 г замарожаных маслякоў абыдуцца ў сярэднім у шэсць з паловай рублёў, паўкіло кансерваваных апенек — мінімум у сем з паловай. Пры жаданні можна знайсці ў продажы і свежыя апенькі (53 рублі за кілаграм, выробленыя ў Расіі).

> **«Сёлета 14 лютага прыпадае на панядзелак — «дзень цяжкі», ды і ва ўмовах пандэміі ў рэстаран ісці, можа быць, і не варта».**

***Ананасы*** — прызнаны афрадызіяк (больш мужчынскі, чым жаночы). Яны змяшчаюць фермент брамелаін, які спрыяе больш хуткаму засваенню бялковай ежы арганізмам і, такім чынам, павышае мужчынскае лібіда. Таксама ў ананасе шмат вітамінаў і калію для паляпшэння фізічнай актыўнасці і настрою. Свежыя ананасы сёння каштуюць ад 6,29 (ім трэба пару дзён на дасяванне) да 8,99 рубля за кілаграм, кансерваваныя ў сіропе — 6,75 за 580 г.

Здольнасцю ўзмацняць любоўнае прыцягненне валодаюць і ***бананы*** — гэта самая, бадай, даступная «экзотыка» абыдзецца ў 3,99-4 рублі за кілаграм.

***Фінікі*** павялічваюць «мужчынскую сілу», здымаюць стомленасць і дрымотнасць (так што станоўча ўплываюць і на жанчын). У старажытных арабскіх тэкстах фінікі называюць стравай, здольнай «усяліць сілы нават у лядашчых старых». Падобным уздзеяннем валодае і ***інжыр***, які змяшчае шмат амінакіслот, што станоўча ўплываюць на лібіда. Прычым сваё ўласцівасці афрадызіяку інжыр захоўвае і ў сушаным выглядзе. Кілаграм фінікаў з костачкай можна сёння набыць (па цэнах Камароўкі) за 3,90, без костачкі — за 5,20. Інжыр (сушаны) выйдзе даражэй — 7,20 за 400 г.

***Спецыі*** — яшчэ адзін старадаўні афрадызіяк, чый станоўчы ўплыў на любоўны настрой пацверджаны і сучаснымі даследаваннямі. Зрабіць «гарачэйшымі» не толькі стравы, але і адносіны ў пары дапамогуць карыца, каляндра, кардамон, востры чырвоны перац, імбір — яны спрыяюць выпрацоўцы эндарфінаў і ўзмацняюць адчуванні. У спецыялізаваных крамах сумесь «Кары» (каляндра, куркума, чырвоны і чорны молаты перац, кардамон, молаты імбір — словам, усё, што трэба) каштуе сёння 3 рублі за 100 г. Паасобку кожная вышэйпералічаная спецыя ў аддзелах спецый на рынку абыдзецца прыкладна ў 2,5-2,8 рубля за 100 г.

А як наконт больш традыцыйных для нас «рэзкіх раслін» — ***цыбулі*** і ***часнаку***? Аказваецца, яны таксама ўтрымліваюць вельмі карысны набор рэчываў для павышэння любоўнага прыцягнення (у першую чаргу, для мужчынскай патэнцыі). Цыбуля багатая на вітамін Е, што дае энергію, часнок — аліцын, які, акрамя антыаксідантнага ўздзеяння, спрыяе магутнаму прытоку крыві ў капіляры. Праўда, дзейнічаюць яны такім чынам толькі ў свежым выглядзе, а з-за спецыфічнага паху наўрад ці іх можна лічыць ідэальнымі кампанентамі меню на 14 лютага.

***Клубніцы*** — традыцыйны прадукт для рамантычнай вячэры. І нездарма. Рэчывы ў складзе гэтых ягад спрыяюць выпрацоўцы «гармонаў радасці», а заадно пастаўляюць у арганізм вітамін С. Свежыя клубніцы (вытворчасць — Арменія) сёння літаральна «залатыя» — 13 рублёў за 250 г. Хуткazамароaccess жаныя — больш даступныя: 400 г каштуюць ад 6 да 6,79 рубля.

І, нарэшце, арэхі — менавіта яны з'яўляюцца чэмпіёнамі сярод афрадызіякаў: насычаюць арганізм энергіяй, праганяюць млявасць і стымулююць сінтэз палавых гармонаў (як мужчынскіх, так і жаночых). Найбольш эфектыўнымі ў гэтым плане сучасная дыеталогія назвала міндаль, фісташкі, кедравыя арэшкі і насенне кунжуту. Вычышчаны міндаль сёння прадаюць па цане 26 рублёў за кг, фісташкі — 39,5 рубля за кг (але кілаграмы і не патрэбныя, для рамантычнай вячэры досыць 100–200 г), кедравыя арэшкі — каля 8 рублёў за 100 г.

Рамантычная вячэра павінна быць бялковай — інакш кажучы, досыць лёгкай і пры гэтым сытнай. Крыніцай лёгказасваяльнага бялку могуць стаць морапрадукты (найбольш бюджэтны варыянт — ***крэветкі*** і ***кальмары***, першыя ў сярэднім 21,69-21,99 BYN, другія — 10-12 рублёў за кг), а таксама бялкі яек (у прыватнасці, ***перапаліныя яйкі*** здольныя рэгуляваць гарманальны фон ва ўмовах стрэсу). Каштуюць 20 перапаліных яек сёння каля 3,5-4 рублёў.

Сярод прадуктаў-афрадызіякаў ганаровае месца належыць таксама ***сырам з цвіллю*** — невыпадкова іх традыцыйна ўключаюць у вясельнае меню многіх народаў. Дыетолагі лічаць, што прычына павышэння лібіда пасля ўжывання такіх сыроў — рэчыва трыптафан, яно стымулюе выпрацоўку «гармонаў задавальнення» ў мозгу. Сыры з цвіллю па традыцыі дарагія. Італьянскі сыр з блакітнай цвіллю абыдзецца каля 14-15 рублёў за 100 г, нямецкі Camembert — каля 9,5 рубля за 125 г, 18 рублёў прыйдзецца не пашкадаваць за столькі ж грамаў французскага Brie. Элітныя сыры айчыннай вытворчасці будуць на парадак таннейшыя. Напрыклад, гарганзола ад Слуцкага сыраробнага камбіната абыдзецца каля 7 рублёў за 100 г.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Извещение о проведении 24 февраля 2022 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о продаваемом имуществе | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-113573, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 133 200,00 | 13 300,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/2, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание арочного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245 | 49 800,00 | 4 900,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117136, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/3, общей площадью 209,0 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0427 га, кадастровый номер – 141000000001005219 | 25 260,00 | 2 500,00 |
| 4 | Капитальное строение* с инв. номером 110/С-113574, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/4, общей площадью 466,2 кв. м, наименование – здание холодильника, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0997 га, кадастровый номер – 141000000001005218 | 61 200,00 | 6 100,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/6, общей площадью 1 212,7 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 146 400,00 | 14 600,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117137, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/9, общей площадью 855,6 кв. м, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000001005217 | 102 000,00 | 10 200,00 |
| 7 | Капитальное строение** с инв. номером 110/С-114895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/10, общей площадью 737,0 кв. м., наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1753 га, кадастровый номер – 141000000001005244 | 88 200,00 | 8 800,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/11, общей площадью 775,1 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211 | 81 600,00 | 8 100,00 |
| 9 | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-117143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/12, общей площадью 212,7 кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212 | 26 640,00 | 2 600,00 |
| 10 | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-114896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/13, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213 | 25 920,00 | 2 500,00 |
| 11 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117142, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/14, общей площадью 291,7 кв. м, наименование – здание кирпичного гаража, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | Площадь – 0,0980 га, кадастровый номер – 141000000001005240 | 34 740,00 | 3 400,00 |
| 12 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/15, общей площадью 703,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243 | 82 200,00 | 8 200,00 |
| 13 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/16, общей площадью 227,5 кв. м, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака | Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214 | 27 000,00 | 2 700,00 |
| 14 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/17, общей площадью 317,2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1457 га, кадастровый номер – 141000000001005215 | 23 820,00 | 2 300,00 |
| **Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации, рекомендуется осмотр** | | | | |
| ** Ограничения (обременения): аренда до 11.07.2022 г. ** Ограничения (обременения): аренда до 31.03.2022 г.* | | | | |
| **Условия торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов | | | | |

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 24.02.2022 по предмету торгов № _ _.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **24 февраля 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.02.2022 по 22.02.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

## Извещение о проведении 23 февраля 2022 года повторных торгов с условиями по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 35»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | «Торговое помещение» с инвентарным номером 500/D-798190604, общей площадью 62,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-253 | 284 400,00 | 28 400,00 |
| 2 | «Торговое помещение» с инвентарным номером 500/D-798190606, общей площадью 35,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-255 | 168 000,00 | 16 800,00 |
| 3 | «Помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения» с инвентарным номером 500/D-798190611, общей площадью 84,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-260 | 272 400,00 | 27 240,00 |
| 4 | «Помещение образовательного, воспитательного и научного назначения» с инвентарным номером 500/D-798190612, общей площадью 148,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-261 | 338 400,00 | 33 840,00 |
| 5 | «Машино-место» с инвентарным номером 500/D-798189933, общей площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 7-86 | 14 040,00 | 1 400,00 |
| 6 | «Машино-место» с инвентарным номером 500/D-798189934, общей площадью 11,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 7-88 | 14 040,00 | 1 400,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Стройтрест № 35», ул. Я. Коласа, 38, 220013, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 35», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 23.02.2022 по предмету торгов № _.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **23 февраля 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.02.2022 по 21.02.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 611-50-44.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 611-50-44 (ОАО «Стройтрест № 35»).

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00011

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Обществу с ограниченной ответственностью «ВТП», УНП 391418293, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 13-9Б/2020 в экономическом суде Витебской области

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое имущество.**

Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (наименование – газопровод) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Софьи Панковой, газопровод к зданию № 7, протяженность линейного сооружения – 220,4, длина трубопровода – 223,00 м.

**Начальная цена**: 5 600,00 белорусских рублей без НДС.

**Минимальная цена:** 3 360,00 белорусских рублей без НДС.

**Лот № 2. Недвижимое имущество.**

Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (общая площадь – 560,47 кв. м, площадь застройки – 376,72 кв. м, процент готовности – 40 %) по ул. Короткевича в г. Витебске, расположенное возле кондитерской фабрики «Витьба» на земельном участке с кадастровым № 240100000003008480 площадью 1,1853 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Короткевича.

**Начальная цена:** 217 000,00 белорусских рублей без НДС.

**Минимальная цена:** 130 200,00 белорусских рублей без НДС.

**Условия электронных торгов:** Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, согласно смете затрат, и оплатить услуги ЭТП согласно Прейскуранту ЭТП, заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов; по лоту № 1: Имущественные права на капитальное строение не зарегистрированы в установленном порядке. Государственная регистрация создания капитального строения осуществляется в установленном порядке по заявлению покупателя на основании договора купли-продажи, решения собрания или комитета кредиторов об одобрении порядка и сроков продажи соответствующего имущества, технических паспортов, составленных по заявлению покупателя, и передаточных актов; по лоту № 2: продажа недвижимого имущества осуществляется под снос без предоставления земельного участка, покупатель обязан обеспечить вывоз строительных материалов от сноса незавершенного незаконсервированного капитального строения с земельного участка в течение 3 месяцев с даты подписания договора.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: нет.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: 12.03.2022 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до **16.00 11.03.2022.**

**Задаток по лоту № 1 в сумме 560,00** (пятьсот шестьдесят рублей 60 копеек) белорусских рублей, **по лоту № 2 – 21700,00** (двадцать одна тысяча семьсот рублей 00 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

**Справочная информация:**

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 29 711-43-22.

Контактный телефон для осмотра объектов + 375 29 711-43-22.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов): в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения предмета электронных торгов по предварительному согласованию с Продавцом.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат и прейскуранта ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производятся на **http://etpvit.by/** до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с законодательством.

# ЛЁГКАЙ ДОЛІ Я ПРАСІЎ У БОГА...

**У палаце іх было чацвёра, і паправіцца, здаровенькай «выйсці на свабоду», хацелася, вядома ж, кожнай... Што зусім не дзіва, бо ў першай — на руках, можна сказаць, старэнькі бацька, у другой дома засталіся дзеці, у трэцяй тут жа, за сценкай, на апараце ШВЛ ляжаў муж...**
**Сур'ёзная матывацыя была і ў чацвёртай. Яна нават доктарцы казала, што дома, на лоджыі, у шафах пакінула «ну такі бардак!.. Такі бардак!.. Не дай бог памру! Людзі збяруцца... І што падумаюць?!»**
**Іншымі словамі, не так важна, што (канкрэтна) выцягвае нас з хваробы. Галоўнае — не здавацца!**

## ЯК ЗМАЛКУ...

Унукі да суседзяў прыязджаюць нячаста. Але ўжо тады — завядзёнка такая — бабуля напячэ піражкоў, заварыць гарбаты, і ўсе разам ідуць гуляць, а цяпер во — катацца з горкі.

Што цікава, малы тады (яму шэсць) разоў колькі з'едзе і стаіць, кажа: «З мяне хопіць. Я ўжо накатаўся» (ляпуецца санкі ўгору цягнуць). А вось малая (ёй пяці няма) адрываецца напоўніцу: куляй ляціць уніз, знізу, з санкамі, бегма ўверх...

Прычым гатова ўсцягнуць нават братавы...

Дзяўчынка?

## ЯЗЫК — ВОРАГ?

Сталіца, кавярня. Іх у цэнтры — як аптэк ды оптык — на кожным кроку. І неяк жа выжываюць, бо народу зусім няшмат: пара чалавек за адным сталом, пара — за другім... Трэці займаюць дзве паненкі ў гадах... Даўно, відаць, не бачыліся. Не сустракаліся б, можа, і зараз, але ж справа ёсць: старэйшая выцягвае з пакета штук з дзесяць драўляных лыжак — паказвае прыяцельцы: «Выбірай».

А ў той, падобна, вочы разбегліся: бярэ то адну, то другую — круціць, параўноўвае, пытае, колькі ж Федзя гэтакіх робіць... І далей (пачуўшы адказ): «Во малайчына! Не тое, што мой. На пенсію выйшаў і сядзіць як пень. Кажу: «Ты б хоць нешта рабіў!» Дык ён яшчэ і злуецца: «Я?! Рукамі?!..» Ён жа, бедны, і праўда — усё жыццё толькі языком. Рукамі — нічога не ўмее».

І ўжо, відаць, не навучыцца?..

## АД ПРАЎДЫ...

Раніца. Холад. Зрэшты, не дурны нехта сказаў, што не бывае дрэннага надвор'я — бывае дрэннае адзенне. Ці проста неадпаведнае — у прыватнасці, таму, што кажуць сіноптыкі.

Сто разоў заракаліся верыць ім, сто разоў збіраліся павесіць на ганку вяроўку. Аўцюковец знаёмы раіў — у якасці барометра. Казаў (даслоўна): «Зірнеш на яе і адразу бачыш: матляецца, значыць, вецер, сухая — цёпла, мокрая — дождж, дае цень — сонца, не дае ценю — ноч, цвёрдая — мароз... Калі нацягнулася — вам ужо добра. А гайдаецца — то гэта не вяроўка, гэта вы...» Барані Божа!

Крок ад смешнага да сумнага, ад праўды да маны.

## НЕ ПАЎЛІК...

Дзень як дзень і людзі як людзі.

У пятніцу, у час вячэры, яны гаварылі, што ў выхадныя трэба было б махнуць у вёску (у іх там хатка свая), набраць бульбы з бурачкамі і яблыкаў.

— Можа, яшчэ ў лес на машыне падскочым, — загадзя папярэдзіла гаспадыня. — Добра б лапак прывезці. Баюся, што ружы мы дрэнна накрылі.

— *А где они у вас?* — насцярожыўся госць, падшыванец-унук. — *И откуда?*

— Усё табе трэба ведаць, — строга заўважыў дзед.

Бабуля адказала:

— Дык у гародчыку ж, пад вокнамі... Бацька твой вясною прывёз.

Пагаварылі так і забыліся б, але назаўтра да іх прыехаў зяць (бацька таго самага ўнука) і з самым сур'ёзным выглядам спытаў:

— *Послушайте, а что вы за ружья в деревне прячете?*

— Ты з чаго гэта ўзяў?! — здзівілася цешча.

— *Да внучок ваш сказал: в огороде, под окнами.*

...І не Паўлік, здавалася б! Не Марозаў, — проста троечнік па беларускай мове...

Не, той не псіхаваў... Але, як заўважыла бабуля, трохі засмуціўся.

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ

Анекдот (адным радком): унук стагадовай бабулі распсіхаваўся і вырашыў сам купіць кватэру.

Чыстая праўда: Лявонісе не сто — на добрых пятнаццаць меней. Не дзіва, што на нагах, не дзіва, што пры памяці і сама сябе абслугоўвае. Дзіва, як сама з сябе смяецца.

Расказвае вось, што купіла новую электразапальнічку для газавай пліты, што праз месяц панесла яе назад у краму, бо тая, з месяц паслужыўшы, зламалася, што сабрала там цэлы «кансіліум», каб прызнаць, што ў запальнічцы села батарэйка і варта яе памяняць...

Гэта лёгка, маўляў, і зрабіць можна тут жа, казалі прадаўцы. Адзінае — якую ўзамен паставіць? Таннейшую — яна гады са два паслужыць — альбо даражэйшую, каб на чатыры хапіла?

Пакупніца, не доўга думаючы, выбрала другую. І назаўтра, відаць, забылася б. Унук нагадаў (ён жанаты, «дзетны», на яго кватэра апісана). Вечарам зайшоў да яе, стаў распытваць, што яна днём рабіла, дзе была. Прыйшлося расказаць...

Болей травы, жней, бывала, вышэй сажнюць, каб сабе засталося. Дык следам за імі начальства па дзялках хадзіла — з лінейкай... І ў крык тады: «Чаму 25 сантыметраў пакінулі, чаму не 15?» Хоць іх жа ўсё адно заараць — па-любому...»

Урок гісторыі, пра якую ўнук ніколі не прачытае ў падручніку.

І наўрад ці пачуе ад сваіх настаўнікаў.

## КАБ ВЕДАЛІ...

Горад, майстэрня, надпіс на сцяне:

«Хочаш дапамагчы малому — зрабі разам з ім

Хочаш дапамагчы старому — зрабі замест яго

Хочаш дапамагчы майстру — не замінай

Хочаш дапамагчы дурню — сам такі».

Як быццам нічога новага — прапісныя ісціны. Але ж нехта сфармуляваў іх?

І тым самым «узброіў» іншых — на першы погляд элементарным: веданнем, як жыць.

## ШЧАСЛІВАЯ...

З правілаў жыцця — не бойся нешта мяняць: часам гэта прыемна, часам карысна, а то і неабходна — як той жа Францаўне... Яна пасля смерці мужа адразу ж сабрала свае пажыткі і пераехала ў горад. У дачкі там асобная кватэра з усімі выгодамі і з нават «лішнім» пакоем — спецыяльна для яе.

А калі так, матуля сама камандавала, як паставіць мэблю, дзе павесіць абразы і вышыўкі, дзе — любімыя фотакарткі. Утульна стала. І цёпла... Прычым ні табе дровы насіць, ні печку тапіць, ні ваду награваць, нават есці варыць і тое не трэба — усё дачка...

З тыдзень гэта радавала, у другі стала засмучаць, а праз месяц... матуля сказала дачцэ: «Ты хочаш, каб я пажыла крыху? Тады завязі дадому, бо тут я, далібог, памру!» — «Мамачка, а там?!» — паспрабавала спыніць дачка. Аднак маці яе не слухала.

Вярнулася дамоў. Жыве. На пытанне, ці не сумна адной, адказвае кароткім: «А з чаго вы ўзялі, што я адна? Я — з Богам».

Шчаслівая. Як шчаслівы, напэўна, кожны, хто шчыра верыць.

## ЛЁГКАЙ ДОЛІ Я ПРАСІЎ У БОГА...

Старасць залежыць ад таго, на што патрачана маладосць.

Праўда ў гэтых словах, вядома ж, ёсць, але не заўсёды, бо вось дзеда Сашу ніхто не папракне — чалавекам жыў, прычым змоладу, а дажывае...

Адзін, як палец (жонка памерла, дзеці за мяжой), амаль глухі, мякка кажучы, нездаровы...

Днямі, казаў, зноў у паліклініку хадзіў, заняў чаргу за нейкай бабуляй. Тая ўсё перажывала, што картку не нясуць — пайшла сама. Ён таксама без карткі стаяў і таксама нерваваўся, таму, пачуўшы за спінай нечае «Хто апошні?», тут жа сказаў, што ведаў: «Я... Але спераду яшчэ адзін чалавек. Ён адышоў... А зараз і я адыду... Вы першай будзеце».

Карацей, узрадаваў жанчыну. І сам пасмяяўся, хоць мо і праз слёзы, бо па дарозе дамоў у думках зноў круцілася крылатае:

*Лёгкой жизни я просил у Бога:*
*Посмотри, как мрачно*
*всё кругом.*
*Бог ответил:*
*подожди немного,*
*Ты еще попросишь о другом.*
*Вот уже кончается дорога,*
*С каждым годом*
*тоньше жизни нить...*
*Лёгкой жизни я просил у Бога,*
*Лёгкой смерти надо бы*
*просить.*

## ТОСТ

З днём нараджэння можна і трэба (у нас, напрыклад, традыцыя) віншаваць не толькі саміх імяннікаў, але і іх родных — бацькоў, дзяцей. Ну, сапраўды, хіба ж не свята ў дачкі, калі маме 91(!), калі яна, нягледзячы ні на што — вайну, галечу, можна сказаць, рабскую працу ў калгасе, непазбежныя страты і хваробы (нават модны каранавірус), — па-ранейшаму гаспадыня — у сваёй хаце, на сваёй сялібе.

У дзень нараджэння дачка з зяцем з'ездзілі туды. Апроч прысмакаў, завезлі трох курачак (да тых, што ёсць). Маці, казалі, рада была. «А калі б вясной, — загадала, — яшчэ і парсючка... Невялічкага...»

Час да той самай вясны яшчэ застаецца. Можа, удасца ўгаварыць, параканаць матулю «паглядзець у пашпарт» і не займацца больш ніякім свінствам (хопіць курэй, катоў і сабакі). Але ж не факт, бо летась, напрыклад, не ўгаварылі: парсючок у матулі быў (і як сыр у масле катаўся!), а пазалетась была яшчэ і кароўка. Адкуль...

Тост не тост, але дай Бог кожнаму і дажыць да такога ўзросту, і не горш пачувацца, і нікога не абцяжарваць...

**Валянціна ДОЎНАР.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ТУТ ВАМ НЕ ТАМ

Знаёмых пчаляроў у Люсі не было зроду: мёд ды іншыя пчалапрадукты (калі ўдала, калі не) купляла на рынку. А тут сяброўка на прапаліс разжылася, падзялілася з ёй, расказала, як настойку зрабіць... Засталося спірту дастаць ці вельмі моцнай гарэлкі, якая прадаецца, сказалі, толькі ў фірменных крамах.

...У найбліжэйшую Люся паехала зранку, заняла чаргу, пакорліва чакала, пакуль крама адчыніцца, ды прыцягвала позіркі мужчын — спачатку тым, што іншых жанчын папросту не было, а яна — інтэлігентная, сімпатычная... А ўрэшце, тым, што брала тры бутэлькі сямідзесяціградуснай, за што мужчыны, відавочна, запаважалі, а хто-ніхто нават памкнуўся быў следам...

Некалі даўно, замалада аўдавеўшы, Люся куды толькі не хадзіла: у кіно, тэатры, канцэрты, музеі, ездзіла на розныя экскурсіі... І — не без таго — прыглядалася да мужчын, можна сказаць, нават шукала новага спадарожніка... Як выглядае — не там.

## УРОК

Дом, вечар, тэлефонны званок. Сваяк на тым канцы провада — з тых, што без прычыны ніколі не турбуюць.

З пытаннем і зараз:

— Слухай сюды, — пачынае здалёк, — ты ж, як быццам, гуманітарый, філолаг трохі?

— Так, — згаджаюся, — трохі.

— Ты ж мовы павінна ведаць?

— Павінна.

— Дык, можа, падкажаш? Мы тут з унукам за ўрокі селі. Скажы, як на рускую перакласці слова «ржышча»? Я ўсіх сваіх знаёмых падняў, — ніхто не ведае.

— *Стерня*, — кажу, не гледзячы ў слоўнік. — Ну, можа, *пожня* яшчэ...

— А лянішча як? — заганяе ў тупік сваяк. — Гэта не для ўнука. Гэта я для сябе пытаюся. Мы, помню, з бацькам яго касілі, каб потым сечкі нарэзаць, каб карову зімой пракарміць. І, калі дазволяць, аўсянішча яшчэ збівалі, ячнішча... Там, дзе

*__АД ЯЕ Ж__ — анекдот. Жонка — мужу: «Так хочацца рамантыкі... Ну, як некалі... Ты мог бы, напрыклад, паклікаць мяне на спатканне?» — «Чаму ж не? Магу. Прыходзь сёння ў дзесяць на кухню. Чаю пап'ём».*

*Між іншым — цудоўная прапанова! І месца! Тым больш — па сённяшнім часе... Карысны напой. А калі да ўсяго прытушыць святло і ўключыць любімую музыку...*

*Потым, дасць Бог, прыйдзе вясна! З'явяцца кветкі і новыя месцы для сустрэч. Галоўнае — дачакацца.*

# З ПЕСНЯЙ ПА ЖЫЦЦІ

**Удзельнікі народнага калектыву «Крынічанька» з Заверша ўжо некалькі разоў выступалі ў перадачах Андрэя Малахава, здымачная група з Масквы не раз бывала ў вёсцы**

**«Крынічанька» ў Завершскім СДК збірае на рэпетыцыі прыхільнікаў народнай песні ўжо 35 гадоў. Калектыў, які мае званне народнага, супрацоўнічае з музеем «Бездзежскі фартушок». І не проста супрацоўнічае. Самадзейныя артысты ў якасці канцэртных касцюмаў выкарыстоўваюць толькі аўтэнтычныя ўборы з бабуліных куфэркаў. У гэтым асаблівая разыначка калектыву.**

## ЗВАННЕ НАРОДНАГА

А песні спяваюць розныя. Найбольш старадаўнія, народныя, запісаныя ў сваіх мясцінах. Часам уключаюць у рэпертуар сучасныя. І ў гэтых жанчын атрымліваецца, бо галоўнае іх багацце — галасы, якімі шчодра адарыла прырода.

— Склад калектыву перыядычна мяняецца, — сказала **кіраўнік «Крынічанькі» Ганна КРЭЙДЗІЧ**. — Некаторых удзельніц, якія пачыналі спяваць у «Крынічаньцы» і зарабілі ёй званне народнага калектыву, ужо няма з намі, на жаль. Прыходзяць новыя. Але нязменна тыя, хто любіць песню, каго не трэба два разы запрашаць на рэпетыцыю альбо канцэрт. Мы спяваем у клубе — так называем свой СДК, спяваем на канцэртах, на святах, дома — з песняй не расстаёмся. Нашым музычным і ідэйным кіраўніком з'яўляецца **акампаніятар Мікалай СЯНЮТА**, які падбірае рэпертуар, праводзіць рэпетыцыі.

Мікалай Сянюта расказаў, як удала складваецца іх супрацоўніцтва з музеем «Бездзежскі фартушок». На гэтыя музейныя майстар-класы падштурхнулі выступленні ў санаторыях. Адпачывальнікі нават з блізкага замежжа вельмі цёпла сустракаюць фальклорны калектыў, пачынаюць падпяваць, танцаваць. Вырашылі зрабіць такія ж імправізацыі для экскурсій, што прыязджаюць у музей народнага адзення. Ім звычайна заспяваюць некалькі песень, пакажуць элементы народных танцаў, і экскурсанты прыходзяць у захапленне, просяць яшчэ павучыць танцаваць альбо заспяваць нешта.

## YOUTUBE-КАНАЛ «ЛЯДОВІЧЫ ФАЗЭНДА»

...Мабыць, так і працягвалася б кар'ера самадзейнага калектыву, з выступленнямі і гастролямі ў межах раёна, з выездамі за яго межы, хіба на «Дажынкі» ды падобныя фестывалі, каб аднойчы Мікалай Сянюта не выклаў песні на YouTube. Спачатку зрабіў гэта, паводле яго слоў, дзеля забаўкі. Свой канал назваў «Лядовічы фазэнда», такім чынам аддаў даніну павагі малой радзіме. Ну і стаў выкладваць песні ў выкананні вясковых самадзейных артыстак, а таксама маладзёжнага саставу «Крынічанькі». Раней гэтая група мела назву «Пацаняты»,назвалі так напаўжартам, калі юным спевакам было па 12-13 гадоў. Гэта дзеці дарослых самадзейных артыстаў — Аляксандр Сянюта, Алеся Крэйдзіч, Вольга Гваздоўская. Выступаць юныя спевакі на Дні вёскі, на іншым мерапрыемстве, Мікалай Іванавіч закіне запіс на канал. Паглядзіць на рэакцыю наведвальнікаў, зробіць нейкія высновы. Пазней ужо стаў стварыць аўтарскія «кліпы», знарок запісваць таго ці іншага выканаўцу. Такім чынам, без усялякіх грашовых укладанняў з дапамогай звычайнага смартфона здымае відэа песні, часцей вядомай і меладычнай, размяшчае ў інтэрнэце. Запісы нечакана амаль адразу сталі набіраць мноства праглядаў.

Гэта ж не смешачкі, калі Вольга Гваздоўская са сваёй песняй яшчэ школьніцай набрала за некалькі месяцаў 13 мільёнаў праглядаў! Каментарыі сталі прыходзіць з Далёкага Усходу Расіі, з Казахстана, ЗША, Германіі.

З часам маладыя артысты сталі больш увагі ўдзяляць кліпам, напрыклад выкарыстоўвалі музейныя экспанаты, старадаўнія рэчы, каб адначасова прасоўваць палескую культуру. А напачатку была толькі песня на фоне роднай прыроды. Меладычная, шчырая, якая нязменна адгукалася ў сэрцах людзей з розных куткоў зямлі.

## ШАНЦ — АДЗІН НА МІЛЬЁН

Аднойчы на канал драгічынскіх самародкаў звярнулі ўвагу супрацоўнікі каманды Андрэя Малахава. Адразу запрасілі на здымкі маладзёнаў. Менавіта Аляксандр Сянюта, Алеся Крэйдзіч і Вольга Гваздоўская праклалі дарогу з Заверша на расійскае тэлебачанне. У перадачы «Прывітанне, Андрэй!» яны спявалі «Купалінку», некалькі сучасных песень. Потым на перадачу была запрошана Наталля Мартыновіч, супрацоўніца Завершскага СДК.

Наталля Уладзіміраўна ў справе вакальнага мастацтва самавучка, спецыяльнай адукацыі не мае, але спявала, колькі сябе памятае. У клубе працуе культарганізатарам. Паездка ў Маскву восенню мінулага года, паводле яе слоў, стала вялікім стымулам у рабоце і самаразвіцці.

Наталля заўважыла, як цёпла яе сустракалі ў расійскай сталіцы, як добра там усё было арганізавана. Запіс працягваўся чатыры з паловай гадзіны, але яна нават не стамілася, не заўважыла, бо ўсё было пастаўлена на найвышэйшым узроўні.

Наталля заўважыла, што спачатку не хацела прымаць запрашэнне, баялася ехаць у Маскву, раней жа далей Мінска і Брэста нідзе не была. Наталля Мартыновіч родам з Украіны. А дакладней, з суседняга раёна, які мяжуе з Драгічыншчынай. У Заверша трапіла дзякуючы замужжу. З першага погляду ўпадабаў беларус Анатоль вясёлую пявунню-ўкраінку, якая прыехала падзарабіць на ўборцы ўраджаю. Вельмі хутка пасля знаёмства яны пажаніліся, ёй толькі васямнаццаць споўнілася, і вось ужо 20 гадоў яна жыве ў Беларусі. Па прафесіі Наталля будаўнік, але даўно ўжо працуе ў сферы культуры. У калектыў трапіла дзякуючы свекрыві, якая заўважыла здольнасці нявесткі да спеваў і пачала выпраўляць яе ў клуб на рэпетыцыі, а сама тым часам даглядала малых унукаў.



Яна ШЫШКО.




Ну а калі патэлефанавалі з Масквы, запрасілі на праграму Малахава, то яе трое дзяцей, старэйшай з якіх 19 гадоў (малодшая ў першым класе), муж, свякроў — усе настаялі. Галава сям'і агучыў меркаванне словамі: «Такі шанц раз на мільён выпадае, грэх не скарыстацца» — і нібы ў ваду глядзеў. Усё атрымалася найлепшым чынам. Успамінаў, эмоцый засталося на доўгія гады. Там яна спявала песню «Без віны вінаватая», якую Мікалай Іванавіч раней выкладаў на YouTube-канале, і народную «Там, на гары». Цікава, што, прадстаўляючы яе, папулярны тэлевядучы сказаў: яе шлях на сцэну толькі пачынаецца.

## ШЛЯХ НА СЦЭНУ, ЯКІ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

Тое ж можна, відаць, сказаць і пра Яну Шышко, якая таксама нядаўна пабывала на запісе перадачы ў Маскве. Яе сапраўднае імя Іванна, але ўсе завуць Янай, жанчына таксама родам з Украіны. Немаўляткам засталася без маці. Рана пачала працаваць, пакручасты лёс закінуў у рэшце рэшт у Беларусь, спачатку ў Камянецкі раён, потым у Драгічынскі, дзе жанчына нарэшце знайшла сваё шчасце. А вось у калектыў трапіла зусім выпадкова. Спачатку Іванна Мікалаеўна шчыравала жывёлаводам на ферме, але праблемы са здароўем прымусілі памяняць род заняткаў. Уладкавалася прыбіральшчыцай у Дом культуры. А далей усё развівалася, нібы ў сюжэце сучаснага серыяла. Галасістая прыбіральшчыца за работай паўтарала, праўда, напаўголаса ўсе песні, якія чула на рэпетыцыях. І аднойчы не заўважылі, прапанавалі далучыцца да спеваў. Яна спалохалася, адмовілася, бо ніколі не выступала са сцэны і баялася. А потым неяк угаварылі, раз-другі заспявала, і справы пайшлі.

Далей сцэнарый вядомы: песня трапіла на вядомы канал «Лядовічы фазэнда», набрала шмат праглядаў, за якімі раздаўся званок з Масквы. Ад нечаканасці яна адмовілася, спаслалася на сямейныя абставіны. А праз два месяцы здымачная група з Масквы зноў завітала ў Заверша, і Яну ўгаварылі. 18 студзеня яна ўжо ехала ў Маскву. Там адбыўся запіс у праграме «Сёння пятніца» з Андрэем Малахавым. Эфір чакаецца ў лютым.

## ВЫПАДКОВА ЦІ ЗАКАНАМЕРНА

Цікава, што супрацоўнікі творчай групы Андрэя Малахава згадалі песні ў выкананні Аляксандра Сянюты, ім спадабалася творчая манера хлопца. Але ж за паўгода ў жыцці вясковага выканаўцы адбыліся змены, яго забралі ў войска. Ды хіба гэта праблема для расійскага канала? Аказалася, не. Здымачная група прыляцела ў Мінск, тут якраз служыць Аляксандр, дамовіліся з кіраўніцтвам вайсковай часці, салдат атрымаў звальненне на некалькі гадзін, за якія запісалі патрэбную песню. І кампазіцыя зноў неўзабаве прагучыць у эфіры.

Ёсць пэўная выпадковасць у тым, што самадзейныя артысты з палескай вёскі Заверша раптам сталі знакамітымі, але ж разам з тым праглядаецца і заканамернасць. Выпадковасць, бо яны не ўкладвалі ў свае кліпы аніякіх сродкаў, як гэта робіць вядомыя і раскручаныя выканаўцы, не разлічвалі на папулярнасць і вядомасць. Спявалі, як умеюць, як робяць гэта для сваіх аднавяскоўцаў, жыхароў суседніх вёсак на розных мерапрыемствах і канцэртах. А рэпертуар, які прыносіў найбольш праглядаў і станоўчых водгукаў, складаўся пераважна з душэўных меладычных песень мінулых гадоў. Вось у гэтым і заканамернасць. Людзі апошнім часам цягнуцца да сапраўднага, добрага, шчырага. Скажам, як гараджане, якія злезлі з паверхаў і пацягнуліся да зямлі, да травы, свежага паветра.

А яны, жыхары Заверша і навакольных вёсак, жывуць з песняй, нічога не прыдумваюць, не абцяжарваюць сябе рэжысурай, пастаноўкай. Сабраліся на пікнік, пасмажылі шашлыкі, выпілі чарку, заспявалі ад душы, выклалі ў сеціва. І ім вераць, звычайным людзям са звычайнай вёскі, адчуваюць еднасць з імі, таму і падтрымліваюць. У грамадстве, як бачым, ёсць попыт на праўдзівае, не выдуманае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з архіва Завершскага СДК.**

*Драгічынскі р-н.*



Здымачная група з Масквы ў гасцях у вяскоўцаў, у цэнтры — Аляксандр СЯНЮТА.

# «Залаты колас» у Сяльцы

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Кожны вясковец, які любіць займацца спортам, асабліва зімовымі відамі, ведае пра лыжны чэмпіянат работнікаў аграпрамысловага комплексу «Залаты колас». Цяпер праходзяць абласныя этапы гэтага лыжнага спаборніцтва. Нядаўна пад старажытным Навагрудкам, у спартыўна-біятлонным комплексе «Сялец», завяршыліся індывідуальныя і групавыя гонкі лыжнікаў Гродзенскай вобласці, у якіх было каля ста дваццаці ўдзельнікаў з дванаццаці раёнаў. Нароўні з мужчынамі на снежную трасу выходзілі прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва, якія з дастойнымі вынікамі перадольвалі двухкіламетровую дыстанцыю. Трэба адзначыць, што сярод жанчын старэйшай узроставай групы на старт выйшлі пенсіянеркі, якія кожны год удзельнічаюць у прэстыжным чэмпіянаце. Найлепшымі сярод лыжніц сталі Алена Пічкоўская са Свіслаччыны і Таццяна Якімовіч з Карэліцкага раёна. У мужчын у індывідуальных гонках наймацнейшымі былі прадстаўнікі Смаргонскага раёна — Максім Шымановіч і Канстанцін Грудзіна.

У другі дзень чэмпіянату праходзіла змешаная эстафета. Хоць надвор'е і не спрыяла лыжнікам — вецер, снег, нават з дажджом, хлюпота пад лыжамі, тым не менш, удзельнікі былі настроеныя рашуча, можна сказаць, па-баявому, і таму паказвалі свае найлепшыя вынікі.

І вось скончыўся забег, журы падводзіць вынікі. Узнагароды, дыпломы і медалі — усё як на сапраўдных Алімпійскіх гульнях. У агульнакамандным заліку гэтым разам адзначыліся Смаргонскі, Шчучынскі і Навагрудскі раёны.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**















## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:** Капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025, площадью 0,2478 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 39 550,00 | Размер задатка, руб. | 3 955,00 |
|---|---|---|---|

**Лот № 2:** капитальное строение с инвентарным номером 132/С-18900 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 6795,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивановский р-н, Мохровский с/с, д. Завышье, ул. Завышанская, 3/3, на земельном участке с кадастровым номером 123085001401000041, площадью 0,2488 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 188 500,00 | Размер задатка, руб. | 18 850,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», 225027, Брестская область, Брестский р-н, район п. Берестье, тел./факс 80162941334. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10-329. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

